№№72–73
(3202–3203)
11–13 мая 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Жадаючых прадаваць газету «Народная Воля» просім тэлефанаваць у рэдакцыю:
8-017-328-68-71 (прыёмная), 8-017-328-63-93.

Мінск, 9 Мая 2010 года

АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ПОГЛЯД

Уладзімір ХАЛІП

Вайна маўклівых

Людзі стаяць на скрыжаванні. І абыякава назіраюць за тым, як гусеніцы танкаў дратуюць гарадскі асфальт.

Па вуліцах потым цяжка будзе ехаць. На рамонт спатрэбяцца мільёны. З іх падаткаў. З іх кішэні. Але ніхто не абураецца, не пратэстуе. Улада ведае, што робіць. Так трэба. Гэта ж свята "са слязамі на вачах". Усё для фронту, усё для перамогі. Для яе нічога не шкада.

Беларусы па-ранейшаму жывуць сярод вайны. Зачапілася яна тут моцна і сыходзіць не збіраецца. А таму кожная чарговая гадавіна Перамогі выглядае крыху дзіўна. Перамога — гэта найперш доўгачаканы мір. Ва ўсякім разе канец вайны. А тут, у нас, яна хіба скончылася?

Час ляціць імкліва. І той майскі дзень далёка ў мінулым. Народжаным ў сорак пятым ужо шэсцьдзесят пяць гадоў. Жыццё пражылі, як поле перайшлі. Змяніўся свет. Стаў іншым. І толькі тут — ніякіх перамен. Усё той жа грукат танкаў. Самалёты ў небе. І неадольнае адчуванне штодзённай прысутнасці вайны. Яе відавочная незавершанасць.

Так, перамога ёсць. Толькі ў якасці пэўнай ідэалагемы. Нейкага знаку тутэйшай адметнасці. Таго непарушнага падмурку, на якім калісьці надзейна ўсталявалася унікальная супольнасць — савецкі народ. І калі нарэшце рассыпаўся гэты дзіўны фантом, недзе на самым ускрайку ацалела, захавалася амаль некранутай, яго немалая частка. Да якой ступені па-ранейшаму савецкай застаецца Беларусь, асабліва бачна ў дні ўрачыстых святкаванняў.

Усё да драбніц — даўняе, савецкае. Начальнік на трыбуне. Крыклівыя, пустазвонныя прамовы. Нічога сапраўднага, шчырага, жывога. Неверагодны грукат бронетэхнікі. Праспект Пераможцаў. І ўсе, як адзін, — таксама пераможцы. І нават Дзень Перамогі ў нас не той, што адзначаюць людзі на розных кантынентах. Дзевятага мая. На дзень пазней. Саюзнікі ўжо святкавалі, а савецкія людзі яшчэ ратавалі свет. І войны нібыта розныя. У іх — Другая сусветная, у нас — Вялікая Айчынная.

А што ж тады казаць пра Беларусь, якая тры гады жыла ў сапраўдным пекле... Сваёй вайной. Зусім не падобнай на тую, якая ішла тады на Усходзе. Там была лінія фронту. А за ёю — тыл. Хоць нейкая ўлада. І так ці інакш, але ж рэгламентаванае жыццё. А па гэты бок толькі адно — крывавы хаос. Той, у каго зброя, тут быў цар і валадар. Няспынныя баі. Карныя аперацыі. Блакады. І пасля таго як фронт пайшоў на Захад, пакуты іх не скончыліся. Вясной сорак чацвёртага тут шмат каму было не да сяўбы — ішлі блакады. Спаленыя вёскі. Жахлівы голад... А роднай савецкай уладзе на тое было глыбока начхаць. Усе, хто заставаўся на акупаванай тэрыторыі, у лепшым выпадку траплялі ў падазроныя. У горшым — у ворагі. З адпаведнымі наступствамі.

Пра ветэранаў кажуць, што яны прайшлі праз агонь вайны. Усё так — паклон ім і пашана. Але хіба праз той жа агонь не прайшлі старыя, жанчыны і дзеці Беларусі? Бомбы або кулі для іх былі не тыя ж, што на фронце? І перад тым, як узарвацца і забіць ці пакалечыць, снарад хіба пытаўся ў жывой мішэні, а колькі ёй гадкоў ад нараджэння?

Старыя той вайны, якім пашчасціла не загінуць, занадта хутка потым сышлі ў нябыт. Жанчыны зніклі ў калгасным моры ціха, непрыкметна, нібы снег на вадзе. І толькі дзеці, незаконныя ўдзельнікі яе, яшчэ дакучаюць уладзе сваёй непажаданай прысутнасцю. Страчанае пакаленне. Пасляваенныя парасткі. Недавучкі. Яны не мелі ніякіх шанцаў прабіцца, заняць прэстыжнае месца. Забяспечыць спакойную, годную старасць.

Цяпер яны стаяць перад вакенцамі аптэк і палахліва падлічваюць свае пенсійныя дзесяткі і дваццаткі, агаломшаныя цэнамі на лекі... Без якіх ім проста ўжо не выжыць. І ўлада на дапамогу ім не прыйдзе. У яе няма на тое сродкаў. У яе свой, дзяржаўны клопат. Вось гэты парад, шыкоўны і ўрачысты. Усё ж для яе, для перамогі. Для нашых слаўных ветэранаў.

Яно так, ды толькі не зусім. На вялікі жаль, тых ветэранаў засталося ўжо няшмат. Нават тым з іх, хто на вайну пайшоў зялёным юнаком або нават падлеткам, ужо за восемдзесят. Няўжо ў гэткім узросце ім хочацца найперш пабачыць парад найноўшай бронетэхнікі, устаноўкі "Град" ды розныя ракеты, якія да іх вайны не мелі дачынення. І наўрад ці хто ў сваіх бліжэйшых родзічаў-ветэранаў заўважыў калі-небудзь гэткую зацятую ваяўнічасць. Дык ці не лепш было б наладзіць у памятныя даты іншыя ўрачыстасці? Не дзеля таго, хто ў гэты дзень у расшытым золатам мундзіры і пагонах неіснуючага звання выходзіць на трыбуну. А менавіта дзеля саміх тых ветэранаў.

Не кідаць бы мільёны пад гусеніцы танкаў. А сабраць старых салдат усіх разам. Сустрэць іх з ротай ганаровай варты. Выказаць пашану. Накрыць сталы. Даць магчымасць ім паразмаўляць паміж сабой. На машынах начальства развезці па хатах. Пацікавіцца, як яны жывуць. Выслухаць уважліва просьбы і скаргі. І ўсім дапамагчы. І не выкрэсліваць іх з памяці да наступных святаў.

А найперш — не аддзяляць іх параднай калонай бронетэхнікі ад усяго народа. Вайна сапраўды была доўгая і цяжкая. Адна на ўсіх.

І яе калісьці трэба скончыць.

charter97.org

ДЕМОКРАТИЯ ПО-БЕЛОРУССКИ

Завтра суд над Александром Козулиным

Александра Козулина задержали 6 мая, сразу после оглашения Верховным судом приговора по делу волковысского предпринимателя Николая Автуховича. За день до этого Александр Козулин объявил о своем намерении участвовать в выборах единого кандидата в президенты от демократических сил.

— Ситуация не предполагала того, что будут какие-то хапуны, — рассказывает Александр Козулин. — В отличие от былых времен и процесс над Автуховичем проходил спокойно, и во время объявления приговора и милиция, и спецназ были корректны ко всем, кто пришел в суд поддержать Николая.

Естественно, что после суда народ скандировал "Свободу Автуховичу!", журналисты записывали комментарии, свою позицию высказывали политики, дипломаты. И никакого особого внимания спецслужбы к нам не проявляли. В такой, в общем-то, спокойной обстановке мы и расходились по домам.

От здания суда мы с друзьями далеко уйти не успели. Когда подошли к светофору и стали переходить его на зеленый свет, появился милицейский автобус и перегородил нам дорогу. Оттуда выскочили люди в форме и сразу ко мне. Я спокойно спросил: "На каком основании меня задерживаете?" В ответ услышал: "Пройдемте". Я вел себя спокойно, ко мне они силы не применяли. А ребят, которых тоже задержали и которые возмущались такими противоправными действиями, стали пинать ногами.

Отвезли нас в Ленинский РОВД, продержали там три часа, составили протокол. Смешно читать, что мне предъявили. Это надо процитировать: *"...по улице Ленина, находясь в общественном месте, громко кричал, нарушал общественный порядок, выражал недовольство решением, принятым Верховным судом Республики Беларусь, на сделанные замечания сотрудником милиции стал выражаться грубой, нецензурной бранью. На замечание прекратить противоправные действия не реагировал, продолжал выражаться нецензурной бранью".*

Как можно это комментировать? В тюрьме, где только матом и ругаются, я за все годы ни одного нецензурного слова не произнес, старался своим примером воспитывать людей. А тут? Это просто анекдот.

— Александр Владиславович, на ваш взгляд, почему именно вас задержали? Может, дело в том, что вы объявили о своем намерении участвовать в президентских выборах? Вы в списке тех, из кого будут выбирать единого кандидата в президенты от оппозиции.

— Мне сложно давать сегодня какие-то комментарии, стратегия выбора единого кандидата только разрабатывается, еще ничего не известно конкретно. Но то, что 6 мая они, недалеко от здания Верховного суда, устроили мелкую расправу надо мной, а по сути — большой правовой беспредел, показывает, что власть агонизирует, что сегодня она слаба. Власти неуверенно себя чувствуют, поэтому и не осмелились вынести приговор Автуховичу 20 лет лишения свободы, как того запросил прокурор. С другой стороны, показывают, что не остановятся ни перед чем, чтобы свою власть сохранить, что любого человека можно схватить посреди улицы, осудить, и он ничего не сможет доказать.

Суд над Александром Козулиным состоится завтра, 12 мая, в 11 часов в суде Ленинского района Минска.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Не адмовіцца?

Аляксандр Лукашэнка, хутчэй за ўсё, не адмовіцца ад удзелу ў прэзідэнцкіх выбарах.

У інтэрв'ю агенцтву Reuters ён заявіў, што яшчэ не прымаў рашэння наконт свайго ўдзелу ў будучых прэзідэнцкіх выбарах. Аднак, па словах беларускага кіраўніка, цяпер няма фактараў, якія прымусілі б яго адмовіцца ад удзелу ў выбарах: *"Мусіць, наадварот, калі б я адмовіўся, то народ бы мяне не зразумеў. Гэта нейкая баязлівасць... Ну, ідзі на выбары: прайграеш — прайграеш, выйграеш — выйграеш. Таму я спакойна да гэтага стаўлюся".*

Лукашэнка таксама заявіў, што не думаў над тым, у якім узросце сыдзе з прэзідэнцкай пасады: "Што датычыць майго ўзросту, то я вам павінен сказаць, што я занадта рана стаў прэзідэнтам, таму вам ужо ў нейкай ступені, мабыць, надакучыў. А ў маім веку толькі-толькі становяцца спелымі палітыкамі, толькі-толькі становяцца прэзідэнтамі. Раней — небяспечна".

Занкавец — Хэнлан: хто каго?

Сёння зборная Беларусі па хакеі правядзе свой другі матч на чэмпіянаце свету, які праходзіць у Германіі. Сапернікамі каманды Эдуарда Занкаўца стануць славакі, якіх на гэтым першынстве трэніруе небезвядомы беларускім балельшчыкам Глен Хэнлан.

Пікантнасць сітуацыі ў тым, што ў свой час Эдуард Занкавец быў памочнікам Глена Хэнлана ў зборнай Беларусі.

"Зборная Беларусі — гэта адкрытая кніга для Глена Хэнлана. Хоць ён асабіста і не бачыў сустрэчу зборнай Беларусі і Казахстана, але ён вывучыў нашага бліжэйшага саперніка даскавала. Хэнлану толькі трэба перадаць нам гэтыя звесткі", — так напярэдадні матча Беларусь — Славакія пракаменціраваў сітуацыю хакеіст зборнай Славакіі **Марэк Свата.**

Яшчэ больш катэгарычным у сваіх выказваннях напярэдадні сустрэчы з беларусамі быў капітан славацкай дружыны **Рыхард Лінтнер**. "*Мы больш не маем права прайграваць. Таму мы сур'ёзна рыхтуемся да наступнага паядынку",* — коратка адзначыў ён.

У сваю чаргу адзін з лідэраў зборнай Беларусі **Міхаіл Грабоўскі** паабяцаў, што гульня супраць славакаў будзе адрозніваецца па змесце ад сустрэчы з Казахстанам: "*Гэта будзе зусім іншая гульня. Мы будзем гуляць з першых хвілін".*

Перад матчам са славакамі ў групе, дзе выступаюць каманды, становішча наступнае: нашы землякі займаюць першае месца, славакі пакуль на трэцім радку. Перамога ў гэтай сустрэчы гарантуе беларусам выхад у наступны этап спаборніцтваў.

Галоўны трэнер зборнай Беларусі **Эдуард Занкавец** таксама коратка выказаўся наконт супрацьстаяння са славакамі: "*Хочацца верыць у тое, што наша зборная яшчэ здольная палепшыць сваю гульню ў матчы са славакамі".*

Нам таксама ў гэта хочацца верыць, Эдуард Канстанцінавіч!

Пачатак прамой трансляцыі матча Беларусь — Славакія сёння, 11 мая, у 21.10 на тэлеканале "Лад". А 13 мая зборная Беларусі правядзе свой заключны матч групавога этапу. У гэты дзень беларусы будуць супрацьстаяць расіянам. Гульня ў прамым эфіры першага тэлеканала. Пачатак — у 17.10.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Ці будзе абраны «адзіны»?

Днямі шырокай грамадскасці быў прадстаўлены праект аб парадку вылучэння адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Яго прадстаўлялі сябры арганізацый, якія ўваходзяць у Беларускі незалежніцкі блок — сустаршыня аргкамітэта па стварэнні "Беларускай хрысціянскай дэмакратыі" Віталь Рымашэўскі, лідэр незарэгістраванага руху салідарнасці "Разам" Вячаслаў Сіўчык, старшыня незарэгістраванага "Маладога фронту" Зміцер Дашкевіч і лідэр незарэгістраванага "Правага альянсу" Юрась Карэтнікаў.

Галоўная ўмова да адзінага кандыдата, якая замацавана ў праекце, гучыць так:

"Кандыдат павінен дамагацца падтрымкі большасці выбаршчыкаў і затым абараняць перамогу ўсімі магчымымі сродкамі. У прыватнасці, у выпадку фальсіфікацыі выбараў кандыдат бярэ на сябе адказнасць за арганізацыю масавых дэманстрацый у сваю падтрымку, нацыянальнага страйку і байкоту нелегітымнай улады".

"Гісторыя правядзення выбарчых кампаній сведчыць пра тое, што тыя, хто ў рэшце рэшт абіраліся адзінымі кандыдатамі, у самы адказны момант не ведалі, што рабіць з людзьмі, якія пад страхам смяротнага пакарання выходзілі на плошчу, каб адстойваць свой выбар і дамагацца рэальных перамен у краіне, — гаворыць Віталь Рымашэўскі. — *Таму на гэты раз адзінага кандыдата будуць абіраць людзі, якія зацікаўлены ў тым, каб іх выбар быў адстаяны. Ні Мілінкевіч, ні Міхалевіч, ні Рымашэўскі паасобку не змогуць здабыць перамогу".*

Усе тыя, хто пажадае ўдзельнічаць у працэдуры вылучэння прэтэндэнтам у адзіныя (крайні тэрмін тут прапаноўваецца 1 чэрвеня. — **Аўт.**), павінны будуць, па задумцы прадстаўнікоў Беларускага незалежніцкага блоку, сфарміраваць свае ініцыятыўныя групы. Дзеля кантролю сапраўднасці спісаў гэтых груп прапаноўваецца стварыць адмысловую камісію. Таго, хто збярэ найбольшую ініцыятыўную групу, БНБ прапаноўвае назваць адзіным кандыдатам.

"*На сённяшні дзень сваю згоду ў працэдуры вылучэння адзінага кандыдата далі Анатоль Лябедзька, Аляксандр Мілінкевіч, Лявон Баршчэўскі, Віталь Рымашэўскі, Мікалай Статкевіч. Што тычыцца Алеся Міхалевіча і Андрэя Саннікава, то ад іх адказу пакуль няма.*

Не выключана, што з'явяцца новыя прозвішчы прэтэндэнтаў. Напрыклад, нечакана Аляксандр Казулін абвясціў вузкаму колу прэтэндэнтаў, што таксама гатовы ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
Тур на фестываль "Дударскі Фэст" (15.05.2010, Дудуткі)!
Тур на фестываль "Навагрудскі замак" (26-27.06.2010, Навагрудак)!
Тур «Шлях на Грунвальд»: Лідзбарк Вармінскі – Ольштын – Мальборк – Грунвальд (13-18.07.2010, Польшча)!
(029) 677 00 46 www.h-t.by

За злачынствы ў інтэрнеце да пяці гадоў турмы

Супрацоўнікі фінансавай міліцыі Камітэта Дзяржкантролю прыпынілі дзейнасць сталічнага інтэрнет-злачынцы. Устаноўлена, што 26-гадовы мінчанін са студзеня 2008-га па кастрычнік 2009 года займаўся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю, абменьваючы электронныя грошы Web money на наяўныя долары ЗША і наадварот.

За час сваёй незаконнай дзейнасці злачынца зарабіў больш за 60 мільёнаў рублёў, мяняючы электронныя грошы на долары. Камісійныя складалі 5% ад сумы, пры тым, што банкі, якія маюць ліцэнзію на падобную дзейнасць, бяруць з кліентаў 15%. За інтэрнет-злачынства гора-прадпрымальніку пагражае зняволенне тэрмінам да 5 гадоў.

Народная Воля
http://www.nv-online.by
11—13 МАЯ 2010 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Михаил Снегирь надеется, что его помилует Лукашенко?

Экс-прокурора Минской области Михаила Снегиря отправляют в колонию усиленного режима на 7 лет. У него отобрали дом недалеко от Цнянского водохранилища, к строительству которого он имел отношение, а также пятикомнатную квартиру на улице Грибоедова в Минске.

Бывший директор ОАО "Забудова" Николай Куделко приговорен к 3,6 года лишения свободы.

Приговор огласили в минувшую пятницу в Верховном суде.

Виновен?

Суд признал Снегиря виновным в злоупотреблении властью или служебными полномочиями, получении взятки, незаконных действиях в отношении огнестрельного оружия, боеприпасов и взрывчатых веществ, а также превышении власти или служебных полномочий.

Михаила Валентиновича лишили классного чина государственного советника юстиции третьего класса. И запретили ему в течение пяти лет занимать руководящие должности на госслужбе.

Трудно судить, насколько справедливый и беспристрастный приговор вынес судья **Алексей Рыбаков**. Как известно, судебный процесс шел за закрытыми дверями. Несмотря на, казалось бы, совсем несекретные статьи, детали данного процесса почему-то предпочли скрыть от общественности.

Теперь Михаил Снегирь уже в другой фоме.

Комментарии

Многие сходятся во мнении, что 7 лет для бывшего прокурора Минской области — это весьма жесткий приговор.

Адвокат и родственники **Николая Куделко** от каких бы то ни было заявлений для прессы отказались. После оглашения приговора они тихо утирали слезы возле здания Верховного суда.

Адвокат Михаила Снегиря **Анатолий Шепелевич** также пока воздержался от комментариев. Сказал только, что и для него *такой* приговор оказался шокирующим.

Жена Михаила Снегиря старалась не плакать. И говорила эта красивая женщина тихо, но очень твердо.

"Это 37-й год... — твердила Анна Макаровна, пытаясь перебороть нервную дрожь. — *Да нет, 37-й год даже отдыхает... Чтобы вот так, ни за что... Господи, почему?.."*

Сын Снегиря **Вадим Снегирь** тоже старался держаться мужественно.

"И зачем было столько времени мучить нашу семью? — рассуждает он. — *Надо было сразу посадить, а не тратить столько времени на бесполезные следствие и разбирательство. Все равно все, как оказалось, без толку... И процесс, на мой взгляд, засекретили только потому, чтобы не было слышно, что там говорят. Нам же отец пишет письма, из которых видно, что происходит... Жалко. И не только нашу семью, но и нашу страну... Когда такое происходит...*

У нас отобрали квартиру. Мы ее купили, продав старую в Троицком предместье. Вселились, начали ремонт. Другого жилья у нас нет. Теперь получается, что меня, мою жену, сестру и маму просто выкинули на улицу. Государству мы не нужны... Кстати, в той квартире находятся некоторые вещи, которые принадлежат не отцу, а нашей бабушке — маминой маме. Но их мы, наверное, тоже уже не увидим..."

В ближайшее время Анна Макаровна и Вадим будут просить о свидании с Михаилом Снегирем.

Кража

Совсем недавно нашли бандита, совершившего налет на коттедж, в строительство которого внес лепту Снегирь.

Напомню, что инцидент случился почти год назад. Из коттеджа вынесли двери, дорогостоящую сантехнику, газовый котел, бойлер, пытались снять окна.

"Нам сказали, что якобы нашли какого-то бомжа, — говорит Анна Макаровна. — *Я вот думаю: а случайно ли, что и приговор, и раскрытие этой кражи практически совпали?.."*

Эмоции

Снегирь считает приговор позорным. И назвал это специфической "благодарностью" за долгие годы безупречной службы.

"Чтобы нас посадить, заинтересованные люди носили мешки денег", — цитирует Снегиря электронная газета "Ежедневник". Экс-прокурор заявил, что его посадила мафия, которая отобрала все, даже нательный крестик, после чего выкрикнул: *"Позор!"*

Эхо прошлого

Михаил Снегирь был тем самым заместителем генерального прокурора, который давал санкцию на задержание небезызвестного офицера **Дмитрия Павличенко,** которого подозревают в устранении **Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского** и **Дмитрия Завадского**. Михаилу Валентиновичу, несомненно, известны некоторые подробности громких исчезновений. Во всяком случае чисто документальные — наверняка. Да и кулуарной информации он может поведать столько, что...

Но Михаил Снегирь молчит. Он принципиально не связывает свои теперешние беды с делами давно минувших дней.

Снегирь уже написал несколько писем на имя А.Лукашенко. Не исключено, что в ближайшее время напишет еще одно — прошение о помиловании. И если Александр Григорьевич будет читать снегиревское письмо в хорошем настроении, то наверняка его простит. Как простил и отпустил нынешнего гендиректора МАЗа, а в прошлом — коррупционера **Александра Боровского**.

Но чуда с помилованием может не произойти. И тогда сидеть придется от звонка до звонка...

Так может, нужно было уже сегодня назвать и фамилии "мафиози", упомянутых Снегирем в день оглашения приговора? И про Павличенко вспомнить?

Говорить или нет — этот нелегкий выбор Снегирь будет делать сам...

Марина КОКТЫШ.

Ці будзе ў Мінску вуліца Васіля Быкава?

Лідэр кампаніі "Гавары праўду!" паэт Уладзімір Някляеў прапануе перайменаваць сталічную вуліцу Ульянаўскую ў вуліцу Васіля Быкава, а таксама прысвоіць імя народнага пісьменніка Беларусі адной са станцый метро, што будуюцца.

Пра гэта ён сказаў падчас выступлення на памінальным мерапрыемстве, якое прайшло каля магілы Быкава на Усходніх могілках Мінска. Акцыя была прымеркавана да 65-годдзя Перамогі.

Някляеў прапанаваў арганізаваць кампанію па зборы подпісаў у падтрымку гэтага перайменавання.

Паэт нагадаў, што Быкава праводзілі ў апошні шлях амаль 50 тыс. грамадзян Беларусі. Таму, упэўнены ён, удасца сабраць не менш як 50 тыс. подпісаў, "а калі трэба — сотні тысяч і мільён".

Падпісныя лісты будуць накіраваны ў камісію па наймянаванні і перайменаванні вуліц, праспектаў, плошчаў і іншых частак горада Мінска.

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

Трэба 10 тысяч долараў, каб купіць у Расіі схему Бабруйскай крэпасці

У Бабруйску аднавіліся працы па ўзнаўленні 3-га палігона Бабруйскай крэпасці. Аднак перашкодай для пачатку паўнавартасных рэстаўрацыйных работ з'яўляецца недахоп каля 200 дакументаў.

Яны знаходзяцца ў Маскоўскім вайскова-гістарычным архіве. Кошт адной копіі складзе прыкладна 1600 расійскіх рублёў (каля 50 долараў). Агулам усе неабходныя дакументы будуць каштаваць Бабруйску каля 10 тысяч долараў.

"Там шмат вельмі падрабязных планаў, будынкаў у разрэзе, на мапах пазначаны дакладна многія пабудовы, размяшчэнне равоў, праекціроўка будынкаў, многія з якіх цяпер амаль разбураныя, — распавёў "Еўрарадыё" першы намеснік дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Бабруйска Уладзімір Джум. — *Гэтыя дакументы неабходныя для таго, каб праекціроўшчыкі і выканаўцы пачалі працу па аднаўленні і рэстаўрацыі 3-га палігона".*

Нагадаем, што аднаўленне Бабруйскай крэпасці цалкам залежыць ад гарадскога бюджэту. На нядаўняй прэс-канферэнцыі загадчык Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік заявіў, што грошай на рэстаўрацыю чакаць не варта. *"У рэстаўрацыю Бабруйскай крэпасці бюджэтныя грошы ўкладвацца не будуць. Варта прыцягваць прыватны капітал",* — заявіў ён.

БОЛЬШАЯ ПОЛИТИКА

Последний шанс Александра Ярошука

Бывший первый заместитель председателя Минского облисполкома, а ныне — глава Белорусского конгресса демократических профсоюзов Александр Ярошук не исключает своего участия в предстоящих президентских выборах.

Кондиции в норме?

— Александр Ильич, так вы намерены идти в президенты или нет?

— Не хочу кокетничать и говорить, будто мне не интересна тема президентских выборов, тем более что почти десять лет назад я уже обозначал свои амбиции. И сегодня этот вопрос по-прежнему занимает мои мысли. Я не исключаю своего участия в президентской кампании. Другой вопрос, при каких обстоятельствах это может произойти...

Прекрасно отдаю себе отчет, что если делать заявление об участии в президентской кампании, то... это мой последний шанс.

— Обоснуйте.

— Да взять хотя бы самую банальную причину — возраст. Мне уже 58 лет. Сейчас я нахожусь в наилучшей форме с точки зрения человеческой, политической, мужской и гражданской зрелости. Я в очень хороших физических кондициях. Мне не чужд здоровый образ жизни: ежедневно занимаюсь зарядкой, бегаю и не собираюсь менять своих привычек в дальнейшем.

— Если я правильно поняла, вы нехорошо относитесь к претендентам на президентский пост, перешагнувшим пенсионный рубеж?

— Мы знаем массу примеров, когда на пост президента избирались люди пенсионного возраста. И в США, и в Японии, и в Литве, а также в некоторых других странах. Но я исхожу из того, что 2011 год для всех нас должен стать последним и решающим.

— *"Для всех нас"* — это вы про оппозицию?

— Я имею в виду демократическое и гражданское сообщество. Мне кажется, перемен хотят не только приверженцы оппозиции. Речь идет об огромном пласте людей, значительная часть которых никак не консолидирована и не смотрит в сторону оппозиции, многие даже негативно к ней относятся...

Российский акцент

— Вы верите в то, что Александр Лукашенко устал и якобы раздумывает, идти или не идти на следующий срок?

— У человека, который сегодня занимает пост президента, великолепно развита интуиция. И мне кажется, он чувствует: лучшего времени для ухода, чем следующий год, просто нет.

Я никогда не относил себя к тем, кто безоговорочно поддерживал Лукашенко. Но при этом я никогда не любил рисовать жизнь только черной краской. И даже в самые трудные для себя моменты, когда, казалось бы, можно было дать волю эмоциям и сполна пройтись по характеристикам режима, я пытался сохранять объективность в оценках. История все поставит на свои места, но сегодня я бы сказал, что Лукашенко сделал немало полезного для страны. Неважно, как голосовали за Лукашенко и как подсчитывали эти голоса. За Александра Григорьевича все равно голосовало больше, чем за других претендентов.

Что касается экономической политики, то будь я на его месте, процентов на 70 делал бы то же самое.

Однако страна уже переросла нынешнюю власть. И Лукашенко, мне кажется, чисто интуитивно это понимает. Поэтому лучшего времени для его ухода не будет. Уйдя гордо и красиво, он займет подобающее место в истории страны.

— Думаю, здесь с вами многие захотят поспорить...

— А пусть спорят. 16 лет — это, извините меня, не кот начхал. И нравится это кому-то или нет, но страна все эти годы развивалась. А сейчас мы подошли к перекрестку. Нужны новые идеи. И новые лидеры. И это побуждает меня идти в большую политику. В том числе и для того, чтобы заявить о недопустимости антироссийских ноток. Ведь ни для кого не секрет, что все те годы, что Лукашенко находится у власти, Россия нас поддерживала. Плевать в колодец, из которого столько лет пьешь...

— Помню, что и десять лет назад вы говорили: "*Наш ориентир: вместе с Россией — в Европу*"...

— Политик должен быть реалистом. Можно строить различные прожекты, объявлять, что завтра мы будем в Евросоюзе или станем очередным штатом США. Но тех, кто так говорит, я не считаю серьезными политиками. Ибо нельзя не учитывать пророссийскую настроенность нашего общества в целом. За последние 10 лет Россия вложила в белорусскую экономику не менее 50 миллиардов долларов. Это и занятость, и пенсии, и зарплаты. Кто и что это может заменить?..

— На всякий случай хочу уточнить: вы ведь не хотите, чтобы Беларусь со временем стала частью России?

— Я не мыслю жизни в иной стране, кроме независимой Беларуси. Я хорошо знаю настроения российских политических элит. И всерьез рассуждать о том, что у них есть какая-то цель узурпации Беларуси — это полная ерунда...

С моей точки зрения, главным пороком и власти, и оппозиции является провинциализм. Местечковое мышление зачастую не дает возможности масштабно посмотреть на происходящие процессы, в том числе оценить роль и значение России. Мне стыдно и за то, что Лукашенко в последнее время позволяет себе в отношении Российской Федерации. Позволю себе напомнить Александру Григорьевичу, что все эти годы он сохранял свою власть не без помощи российской элиты.

Гордые и не понятые... придурки

— Можете сформулировать мотивы, которые двигают вас в президенты?

— Первый — политика нынешнего руководства страны, которая ведет нас в тупик. Второй — то, что сегодня происходит в оппозиции. Я без возмущения уже не могу говорить об этом. Беда в том, что оппозиция является зеркалом власти, не извлекает уроков и ничему не учится. И сейчас можно говорить об определенном вырождении оппозиционеров. Не хочу рассуждать, кто на это влияет: власть, спецслужбы... Конечно, все это присутствует. Но легче всего искать виноватых. Если есть цель победить, зачем отталкивать от себя тех нормальных людей, которые есть и в номенклатуре, и в силовых структурах? Смею вас уверить: если бы я все эти годы своим коллегам-чиновникам без конца говорил: мол, вы — рабы, и мы рано или поздно придем к власти и с вами разберемся... Ну, был бы гордым и не понятым придурком. Таких много в нашей оппозиции.

— Судя по всему, вы сохранили свои связи в номенклатуре?

— Вне всякого сомнения. И знаю, что руководители многих ведомств делают свою работу не благодаря, а как раз вопреки проводимой официальной политике.

Представьте, что завтра сменится власть. Кто будет управлять страной, заниматься экономикой? Я, например, со страхом наблюдаю за теми людьми, которые говорят, что мы вначале до основания все разрушим, а затем начнем безудержную либерализацию и все остальное...

Если мы на самом деле хотим развиваться, то обязательно должны говорить о преемственности государственной политики. Хватит уже все отрицать и поддаваться эмоциям. И в данном случае лакмусовая бумажка — отношение к Лукашенко. На нем не стоит ставить крест. Иначе придется поставить крест и на тех, кто придет после него.

— А вариант преемника вы не рассматриваете? Например, тот же Сергей Сидорский даже чаще многих оппозиционеров ездит в Москву. И вроде как дружит с Путиным...

— Сомневаюсь, что это можно назвать дружбой. И не очень верю в возможность такой комбинации. Хотя российское руководство вполне может согласиться, что преемником Лукашенко будет человек не радикальный, не антироссийский, который не напрягает своим возможным приходом к власти.

Денег много не бывает

— Сколько по вашим скромным подсчетам нужно денег на президентскую кампанию?

— Много. Не меньше 50 миллионов условных единиц.

— У вас будет такой ресурс?

— Поймите меня правильно: я сам не занимаюсь выколачиванием денег. И не собираюсь этого делать...

— Ждете, пока вам все принесут на блюдечке с золотой каемочкой?

— Не жду. Хотя где-то такое мнение и складывается. Все несколько иначе. Я не буду поступать так, как многие делают — предлагать себя и тем самым девальвировать... Есть люди и структуры, которые здесь, внутри страны, настойчиво предлагают мне идти в президенты. Обещают и человеческую, и ресурсную поддержку.

— Тогда почему не организуете банкет и не объявите, что покушаетесь на трон?

— Поймите правильно: я не хочу просто прокукарекать... Если бы меня манил политический бизнес, возможность заработать пару сотен тысяч, тогда да. Но я не хочу зарабатывать на судьбе своей страны — не могу себе этого позволить. Поверьте, это не высокие слова. Последнее дело сейчас заниматься подобным бизнесом...

— Если я правильно поняла, вы претендуете на звание "единого кандидата от демократических сил"?

— Сегодня момент истины не только для Лукашенко, но и для оппозиции. И у каждого, кто уже заикнулся о президентских амбициях, могут быть очень веские аргументы в свою пользу. Этот молодой — ему надо начинать. Тот уже старый, ему нужно последний раз засветиться. Этот — проевропейский и считает, что Беларусь должна быть только в Европе. Но в совокупности все это не стоит выеденного яйца. Потому что нужно выбрать компромиссную и значимую во всех смыслах фигуру.

— А если предполагаемые "вожди" не договорятся и "единого" не будет?

— Тогда я освобождаю себя от всякой ответственности и, смею вас уверить, что я созрел к конкретным действиям. Мы не малые дети и должны отдавать себе отчет, насколько пагубны такие действия. Речь идет о жестких мужских отношениях.

— Десять лет назад, идя на выборы, вы заявили: *"Я не из тех спортсменов, кто руководствуется принципом "не догоню, так согреюсь". Я собираюсь не только "согреться", но и догнать"...*

— Может, тогда мне представлялось, что я бегу спринт. А сейчас уже совершенно очевидно, что это марафон. А такую дистанцию без запаса терпения пробежать невозможно.

— И вы снова уверены, что добежите до финиша?

— Конечно. Я вспоминаю, каким я был 10 лет назад и могу сказать, что в основном это был сырой человеческий материал. И сегодня мне неловко за многие свои слова, действия, мысли. Я сейчас имею гораздо больше опыта. И по-другому смотрю на многие вещи. Сейчас наивысший пик моей формы. Я могу в полной мере отвечать за свои слова и поступки и понимаю, каким образом должна формироваться политика государства. Я готов продолжать многое из того полезного, что было сделано Лукашенко, но при этом буду двигаться дальше. И я верю, что первый белорусский президент, взвесив все "за" и "против", на этот раз примет решение уйти.

«Сарафанное радио» переплюнет телевидение

— Объясните, как можно выиграть президентские выборы без доступа к телевидению? Не зря же Александр Зимовский сказал, что Белтелерадиокомпания стоит больше, чем "Белтрансгаз"...

— Зимовский мыслит однолинейно. Раньше не было телевидения и все обо всем знали. И о кандидатах, и о том, что в стране происходит.

— Так вы при помощи "сарафанного радио" собираетесь распространять информацию про альтернативу Лукашенко?

— По совокупности. Есть разные процессы управления обществом. Не надо демонизировать власть. И возводить в абсолют ее возможность все тотально контролировать. Это невозможно.

— Запрещенных приемов со стороны спецслужб не боитесь?

— Не знаю, достоинство это или недостаток, но я совершенно спокоен по поводу возможного компромата. Я сам не очень верю, когда говорят: "Ни дач, ни квартир, ни любовниц у меня нет". Как сказал в интервью "Народной Воле" Владимир Гончарик, "прожил 70 лет, но безгрешным не был". И я не без греха. Но компромат — как штукатурка. От ровной стены отвалится, а к неровной обязательно пристанет. У меня достаточно ровная поверхность, чтобы на это оглядываться.

Что касается каких-то страхов... Одно время меня очень тщательно досматривали на границе. И при въезде и при выезде. Я от этого радости не испытывал, но ни разу не сказал ни пограничникам, ни таможенникам грубого слова — у них такая работа. А меня эти досмотры мотивировали.

Если вести речь о физических мерах воздействия, то интуиция мне подсказывает, что больше в Беларуси люди за свои взгляды гибнуть не будут. Юрий Захаренко, Виктор Гончар, Анатолий Красовский и Дмитрий Завадский заплатили ценой своей жизни, прикрыли всех остальных...

И мне кажется, что не будет у нас кыргызского развития событий. Все обойдется без крови и погромов...

Марина КОКТЫШ.

У беларускай арміі з'явіліся першыя жанчыны-палкоўнікі

Упершыню ваеннаслужачым-жанчынам беларускай арміі прысвоена воінскае званне "палкоўнік".

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны, у адпаведнасці з указам прэзідэнта №226, падпалкоўнікам медыцынскай службы Ларысе Бабушкінай і Марыне Перавёртавай прысвоена чарговае воінскае званне "палкоўнік медыцынскай службы". Афіцэрскія пагоны палкоўнікам ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў міністр абароны Юрый Жадобін.

Ларыса Бабушкіна і Марына Перавёртава праходзяць службу ў 432-м Галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных сіл на воінскіх пасадах намесніка начальніка цэнтра — начальніка медыцынскай часці амбулаторнага цэнтра і намесніка начальніка цэнтра — урача-эндакрынолага гастраэнтэралагічнага цэнтра.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

Магілёўскі кіраўнік адукацыі гатовы сам збіраць заявы ў беларускія класы

Днямі ў Магілёве адбылася сустрэча начальніка аддзела адукацыі Магілёўскага гарвыканкама Сяргея Казлова з бацькамі, якія хочуць вучыць сваіх дзяцей па-беларуску. Падчас сустрэчы была вызначана творчая група з двух бацькоў — Аляксея Бацюкова і Змітра Салаўёва.

"Наша задача — праводзіць маніторынгі, апытанні грамадскай думкі наконт беларускамоўнай адукацыі ў Магілёве, — кажа Аляксей Бацюкоў. — *Таксама, вядома, мы будзем заахвочваць і ангажаваць бацькоў, дзеці якіх дасягнулі школьнага ўзросту, абраць беларускую мову для адукацыі сваіх дзяцей".*

Сяргей Казлоў таксама па магчымасці папулярызуе беларускі клас, для адкрыцця якога трэба 20 заяў ад бацькоў. На сайце аддзела адукацыі гарвыканкама з'явіўся яго зварот, у якім, між іншым, гаворыцца: *"Зазвычай заява пішацца на імя дырэктара школы падчас паступлення ў першы клас. Бацькі ўказваюць тое, на якой мове жадаюць навучаць дзіця. Цікавасць кожнага вучня і бацькі ўлічваецца! Сёння я сам гатовы збіраць гэтыя заявы".*

Посол Литвы посетил Хатынь

Накануне Дня Победы посол Литвы в Беларуси Эдминас Багдонас и сотрудники посольства этой страны посетили мемориальный комплекс "Хатынь". Они возложили цветы и минутой молчания почтили память людей, заживо сгоревших здесь в 1943 году.

Это уже стало традицией: на протяжении 13 лет в канун 9 мая представители дипмиссии Литвы возлагают цветы к Вечному огню мемориала "Хатынь".

— Слава Богу, что мы не знаем этого страха, не знают его наши дети, — отметил Эдминас Багдонас. — Но мы должны это помнить, знать сам факт этих зверств, сколько людей погибло, каким способом и для чего это делалось. И наши дети должны это знать. Поэтому так важны памятные дни. В Литве тоже отмечается день окончания Второй мировой войны 8 мая и 9 мая — День Европы, когда о погибших в той страшной войне скорбят все европейцы. Мы помним, знаем и чтим эти дни.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля
http://www.nv-online.by
11—13 МАЯ 2010 г.

СРАВНИМ?

Две стороны медали

12 мая в Женеве в рамках сессии Совета по правам человека ООН, посвященной проведению Универсального периодического обзора, планируется рассмотрение отчета о положении с правами человека в Беларуси, после чего будут сделаны выводы и заявлены рекомендации по улучшению положения в этой области.

Надо отметить, что будет рассмотрен не только Национальный доклад, подготовленный Министерством иностранных дел Беларуси (МИД), но и материалы, которые подготовили для Универсального периодического обзора белорусские независимые правозащитные организации (НПО).

Вот фрагменты из этих двух докладов по основным позициям.

ПРАВО НА СПРАВЕДЛИВЫЙ СУД

МИД

Законодательство гарантирует защиту прав и свобод гражданина компетентным, независимым и беспристрастным судом в определенные законом сроки. Никто не может быть признан виновным в совершении преступления и подвергнут уголовной ответственности иначе как по приговору суда и в соответствии с законом.

НПО

На практике принцип независимости судей серьезно нарушается. Реальное участие судейского самоуправления в подборе кадров на должности судей, их дальнейшее продвижение по службе, а также в вопросах увольнения сведено к минимуму. Имеются серьезные проблемы в обеспечении публичности уголовного процесса. Граждане не имеют права подачи конституционной жалобы. Для проверки конституционности нормативных правовых актов в Конституционный суд могут обратиться президент, правительство, палаты парламента, Верховный суд и Высший Хозяйственный суд, однако этот механизм неэффективен, поскольку указанные органы в последние три года такую проверку не инициировали.

СВОБОДА СОБРАНИЙ

МИД

Конституция гарантирует свободу собраний, митингов, уличных шествий, демонстраций и пикетирования, не нарушающих правопорядок и права других граждан. Основополагающим принципом проведения публичных мероприятий является обеспечение общественной безопасности и порядка при их проведении.

НПО

В Беларуси существует разрешительный характер организации и проведения собраний. Сложность и длительность процедуры получения разрешения, возможность произвольного отказа серьезно ограничивает свободу мирных собраний. Практически каждое из мирных собраний, проходящих без разрешения властей, прекращалось правоохранительными органами, оканчивалось массовыми арестами их участников и применением милицией физической силы и специальных средств. В ряде случаев их участники и организаторы привлекались к уголовной ответственности за организацию либо активное участие в групповых действиях, грубо нарушающих общественный порядок.

СВОБОДА АССОЦИАЦИЙ

МИД

В настоящее время в Беларуси действует 2,5 тыс. общественных объединений различной направленности и 15 политических партий. При этом количество общественных объединений стабильно увеличивается, что свидетельствует о гражданской активности населения и наличии возможностей для ее проявления. Только за 2009 год численность общественных объединений увеличилась на 20 процентов, количество организационных структур политических партий возросло на 18 процентов.

НПО

Законодательство устанавливает сложный порядок регистрации общественных объединений, в том числе политических партий и профсоюзов. С 2000 г. в Беларуси не было зарегистрировано ни одной новой политической партии, многим партиям было отказано в регистрации. Деятельность незарегистрированных общественных объединений, партий, религиозных объединений запрещена с 1999 г., а с 2005 г. за нее установлена уголовная ответственность.

ПРАВО НА ЖИЗНЬ

МИД

В вопросах законодательного регулирования и применения смертной казни Беларусь строго следует рекомендациям, закрепленным в соответствующих статьях Международного пакта о гражданских и политических правах. В законодательстве прямо закреплен временный и исключительный характер.

НПО

На данный момент Республика Беларусь остается единственной страной в Европе и странах бывшего СССР, практикующей использование смертной казни. Процедуры исполнения смертных приговоров в Беларуси Комитетом ООН по правам человека расцениваются как негуманное и бесчеловечное обращение.

ЗАПРЕТ ПЫТОК

МИД

Принципы и нормы Конвенции ООН против пыток и других жестоких, бесчеловечных или унижающих достоинство видов обращения и наказания нашли отражение в Уголовном, Уголовно-процессуальном и Уголовно-исполнительном кодексах. Белорусское законодательство и практика его применения основываются на строгом соблюдении гарантий защиты от пыток, насилия и другого жестокого или унижающего человеческое достоинство обращения. Законодательство запрещает применение насилия и жестокое, негуманное обращение по отношению к участникам уголовного процесса, а также лицам, содержащимся под стражей.

НПО

Правозащитники получают многочисленные жалобы о применении пыток в правоохранительных органах. Пенитенциарная система Беларуси закрыта для общественного контроля, что не позволяет в достаточной мере исследовать условия содержания заключенных. Применения должностными лицами пыток, жестокое обращение с задержанными и арестованными носит латентный характер, информация об этом редко становится предметом гласности.

ЗАПРЕТ ПРИНУДИТЕЛЬНОГО ТРУДА

МИД

Запрет принудительного труда, закрепленный в законодательстве, направлен против эксплуатации человека, на защиту его чести и достоинства. Количество преступлений, связанных с трудовой эксплуатацией, незначительно. Случаев использования труда несовершеннолетних не выявлялось.

НПО

Министерство обороны привлекает военнослужащих в период прохождения военной службы к работам и исполнению иных обязанностей, не обусловленных военной службой. Распределение молодых специалистов в Беларуси используется как метод мобилизации и использования рабочей силы для нужд экономического развития страны и отдельных регионов без соблюдения принципа добровольности найма. Закон "О мерах принудительного воздействия в отношении хронических алкоголиков и наркоманов, систематически нарушающих общественный порядок или права других лиц" устанавливает, что хронические алкоголики и наркоманы могут быть по решению суда принудительно изолированы в лечебно-трудовых профилакториях для медико-социальной реадаптации с обязательным привлечением к труду. На этих лиц не распространяются гарантии трудового законодательства.

ПРАВО НА СВОБОДУ И ЛИЧНУЮ НЕПРИКОСНОВЕННОСТЬ

МИД

Законодательством закреплен ряд гарантий от произвольного задержания. Заключение под стражу как мера пресечения применяется только в отношении лица, подозреваемого или обвиняемого в совершении преступления, за которое законом предусмотрено наказание в виде лишения свободы на срок свыше 2 лет. Административное задержание может производиться в случае совершения гражданином административного правонарушения на срок не более трех часов и может быть обжаловано прокурору или в суде.

НПО

Введенный в действие в 2000 г. Уголовно-процессуальный кодекс сохранил традиционные недостатки регулирования процедур задержания и применения заключения под стражу как меры пресечения. Значительные нарушения свободы и личной неприкосновенности регулярно происходят при разгонах силами правопорядка участников мирных оппозиционных акций протеста. В 2008—2009 гг. свыше 2 миллионов человек под различными угрозами подверглись принудительной дактилоскопии. Жалобы граждан на допущенные сотрудниками милиции нарушения не рассматриваются надлежащим образом органами прокуратуры и судами.

Літва супраць

Афіцыйны Вільнюс заявіў, што не ўхваляе будаўніцтва беларускай АЭС.

Пра гэта сказана ў афіцыйнай пазіцыі, падрыхтаванай Міністэрствам аховы навакольнага асяроддзя Літвы. Дакумент будзе перададзены Беларусі, паведамляе інтэрнет-партал Delfi.

У дакуменце гаворыцца, што ацэнка ўздзеяння будучай АЭС на навакольнае асяроддзе недастаткова вычарпальная, таму Літва просіць правесці яе паўторную прэзентацыю. Аднак Беларусь не абавязана ўлічваць меркаванне Літвы па гэтым пытанні.

У дакуменце выкладзена крытыка пляцоўкі, няпоўнай справаздачы, недастаткова падрабязнага апісання рэактара, няяснага парадку ўтылізацыі радыеактыўных адкідаў і г.д.

Ущерб, наносимый человеком природе, скоро начнет негативно сказываться на экономике многих стран, говорится в подготовленном к публикации докладе ООН.

Авторы третьего доклада под заголовком "Глобальный обзор разнообразия видов" предупреждают, что некоторые экосистемы скоро достигнут критической точки и начнут приносить все меньше пользы человеку.

Уже подсчитано, что убытки от ежегодного сокращения лесов можно оценить в 2—5 млрд долларов, что куда больше, чем потери от глобального финансового кризиса.

"Многие страны закрывают глаза на огромную стоимость животных, растений и других форм жизни и их роль в поддержании здоровых и функционирующих экосистем", — говорит Аким Стейнер — исполнительный директор Программы ООН по окружающей среде.

В Евросоюзе решили защищать евро — «любой ценой»

Европейский Союз предпринимает срочные меры, чтобы воспрепятствовать системному кризису, поразившему зону единой европейской валюты — евро.

Министры финансов стран Евросоюза поздно вечером в воскресенье в Брюсселе договорились о создании стабилизационного фонда ЕС.

Министр финансов председательствующей в Евросоюзе Испании Елена Сальгадо сообщила журналистам о договоренности создать крупнейший в истории мировой экономики финансовый механизм. Объем будущего стабилизационного фонда ЕС с учетом средств Международного валютного фонда составит 750 миллиардов евро.

Эта сумма включает 60 миллиардов, обеспечиваемых Еврокомиссией, еще 440 миллиардов гарантируются государствами-членами, и доля Международного валютного фонда может составить 250 миллиардов евро.

Берлин претендует на роль мирового лидера в автоэлектрификации

Миллион электромобилей на дорогах Германии к 2020 году. Такова амбициозная цель, которую поставил перед автопроизводителями, автодорожными и коммунальными службами немецкий министр транспорта Петер Рамзауэр. И она осуществляется.

Заявлено, что правительство Германии намерено более тесно сотрудничать с автоконцернами в разработке и выпуске электромобилей. Об этом на днях сообщила федеральный канцлер Ангела Меркель, открывая в Берлине "встречу в верхах" представителей авто- и электроиндустрии. Как сообщает агентство DAPD, участники саммита намерены объединить усилия в целях реализации национальной программы электрификации автопрома. По мнению Меркель, создание автомобилей с электрическим приводом должно стать одним из главных направлений в разработке новых технологий.

Как заявил глава концерна Daimler Дитер Цетше, немецкий автопром в течение ближайших трех лет намерен вложить до 12 миллиардов евро в разработку автомобилей с альтернативным приводом. В этой связи особое значение приобретают меры стимуляции со стороны государства. Из федерального бюджета на разработку и вывод на рынок автомобилей на электротяге уже выделено около 500 миллионов евро. В частности, стартовали восемь региональных пилотных проектов по тестированию опытных образцов электромобилей и созданию необходимых условий для их эксплуатации.

Тихий щелчок — и машина тронулась с места. 70-летний Рольф Бауэр — один из добровольцев, кому посчастливилось испытать на практике новенький "Электро-Смарт". На протяжении восьми недель он каждый день садился за руль микроэлектрокара. "Я очень доволен. Машина рвет с места, как пожарная, — восхищается Рольф Бауэр. — Разгоняется она просто отлично. И главное: без выхлопной трубы!"

Электромобиль не только обходится без выхлопа, но и едет бесшумно, отмечается на сайте "Немецкой волны". Одной подзарядки хватает на 150 км пробега. Пока по улицам немецкой столицы колесит всего сотня таких машин. Через 10 лет их должно быть 100 тысяч. Берлин твердо намерен сыграть роль первопроходца в области электрификации транспорта.

С мексиканской свадьбы похитили жениха и двоих свидетелей

Вооруженные преступники сорвали свадебную церемонию в мексиканском Сьюдад-Хуаресе, который считается одним из самых криминальных городов Мексики. Об этом сообщает El Heraldo de Chihuahua.

По свидетельствам очевидцев, когда церемония бракосочетания близилась к завершению, к церкви подъехали два фургона, откуда вышли восемь вооруженных человек. Бандиты ворвались в церковь и под угрозой расправы увезли в неизвестном направлении жениха и двух свидетелей — его брата и брата невесты.

Перед похищением участников церемонии бандиты убили одного из гостей. По одной версии, мужчина попытался сбежать от преступников, однако получил смертельное ранение в спину. По другой — он решил оказать сопротивление нападавшим, но силы оказались не равны, и его убили.

В полиции склоняются к версии, что речь идет о криминальных разборках между противоборствующими наркокартелями, отмечает AFP. Об этом говорит тот факт, что похитители так и не потребовали выкуп за захваченных людей.

В Таиланде оппозиция согласилась с датой досрочных выборов

В Таиланде лидеры оппозиции согласились с предложенной премьером датой досрочных парламентских выборов.

По сообщениям из Бангкока, стороны договорились, что выборы состоятся 14 ноября, как и предлагал глава правительства Абхисит Ветчачива.

В ходе столкновений участников оппозиционных митингов с полицией в начале апреля погибли 29 человек. Оппозиционеры заявляют, что прекратят массовые выступления в центре Бангкока лишь после того, как будут привлечены к ответственности члены правительства, которых они считают виновными в гибели людей.

НОВЫЕ ПРОФЕССИИ

Лоббисты

По оценкам неправительственной организации Lobbycontrol, только в Берлине насчитывается около пяти тысяч лоббистов. Их работодателями являются не только крупные отраслевые объединения, но и мозговые центры, PR-агентства и юридические конторы.

Особым спросом в качестве лоббистов пользуются бывшие члены правительства, хорошо знакомые как с политической кухней в целом, так и с крупными политдеятелями в частности.

Самый известный в ФРГ лоббист — экс-канцлер Герхард Шрёдер. Аналогичной деятельностью занимался, покинув "большую политику", и его предшественник Гельмут Коль. После отставки он, в частности, консультировал медиа-магната Лео Кирха, получая за это, по данным издания Manager magazin, 600 тысяч евро в год.

Проиграв выборы в сентябре 2005 года, Шрёдер тоже недолго сидел без работы. Уже в декабре того же года он принял предложение Владимира Путина возглавить комитет акционеров консорциума Nord Stream. В этот консорциум, который занимается строительством газопровода по дну Балтийского моря из России в Германию, входят, помимо "Газпрома", немецкие концерны E.ON и Wintershall.

По данным журнала Manager magazin, экс-канцлеру предложили в качестве вознаграждения миллион евро в год, но сам он посчитал, что это вызовет непонимание в немецком обществе, а потому попросил платить ему вчетверо меньше — 250 тысяч евро. Примерно столько же зарабатывает и федеральный канцлер.

Почти 40 процентов потребляемого природного газа Германия импортирует из России. Новый проект станет гарантией бесперебойных поставок, потому что из него исключены страны-транзитеры, не устает повторять Шрёдер.

У этого газопровода появился конкурент — Nabucco. По нему Евросоюз хочет получать природный газ из Центральной Азии, а также Азербайджана и, возможно, Ирана, минуя Россию. И вот совпадение — одним из лоббистов этого проекта является Йошка Фишер, старый знакомый экс-канцлера. Фишер, будучи лидером "зеленых", семь лет занимал пост вице-канцлера и министра иностранных дел в правительстве Шрёдера.

После отставки в том же 2005 году экс-глава МИД тоже отошел от политики — читал лекции в Принстонском университете, писал комментарии для газет. Но с 2009 года и Фишер активно занимается лоббистской деятельностью. Бывший министр продвигает Nabucco, представляя интересы сразу двух инициаторов проекта — немецкого энергетического гиганта RWE и австрийской компании OMV.

По словам Фишера, диверсификация поставок отвечает европейским интересам. "Проект Nabucco не направлен против России, она останется главным поставщиком газа для ЕС и Германии", — уверяет экс-министр. Но поиск альтернативных маршрутов, говорит Фишер, не что иное, как дань здравому смыслу. Следуя ему, Фишер должен убедить Азербайджан и Туркмению в том, что участвовать в этом проекте им выгодно, однако его задача сводится не только к этому. "Сильная политическая поддержка — вот что требуется проекту Nabucco прежде всего", — уверен бывший глава германского МИД.

Для организации этой поддержки его, собственно говоря, и пригласили к участию в проекте

Йошка Фишер, бывший идеолог партии "зеленых", консультирует сегодня не только энергокомпанию, управляющую в ФРГ атомными электростанциями, но и концерн Siemens, который проектирует АЭС, а также автогигант BMW. Свои сегодняшние доходы он не афиширует.

Экс-канцлер Шрёдер, по оценкам журнала Manager magazin, зарабатывает в год примерно полтора миллиона евро. Отдыхать Шрёдеру особо некогда — его график и сейчас часто расписан по минутам. Контакты, приобретанные за годы в политике, — это капитал, причем в буквальном понимании этого слова.

Экс-канцлер представляет интересы не только консорциума Nord Stream, но и компании ТНК-ВР (экс-канцлер входит в состав совета директоров), швейцарского издательского дома Ringier и парижского банка Ротшильдов. Шрёдер пользуется спросом и в качестве консультанта, особенно если речь идет о выходе на политических деятелей России, КНР, Турции, на Ближнем Востоке.

Шрёдера приглашают в качестве посредника не только при заключении крупных сделок, но и для урегулирования конфликтов. Кроме того, именно бывший канцлер помог немецкому футбольному клубу "Шальке 04" заполучить в качестве главного спонсора российский "Газпром".

Любопытно, что нынешняя конкуренция Фишера со Шрёдером носит заочный характер. Расстояние между их нынешними офисами в Берлине (у одного — на Унтер-ден-Линден, у другого — на Жандарменмаркт) — менее километра.

По сообщению влиятельного немецкого еженедельника Der Spiegel, после того как Фишер согласился лоббировать строительство газопровода Nabucco, свою новую деятельность он со Шрёдером не обсуждал. Как пишет журнал, это раньше они были друзьями, теперь же — просто знакомые, которых работа на конкурирующие проекты явно не сблизит, отмечает автор статьи Вячеслав Юрин на сайте "Немецкой волны".

www.kamunikat.org

Народная Воля
http://www.nv-online.by
11—13 МАЯ 2010 г.

ПІША ВЕТЭРАН...

Галоўнаму рэдактару газеты "Народная Воля"
Глыбокапаважаны Іосіф Паўлавіч!
Я ніколі не была аўтарам "Народнай Волі" — толькі нязменная ваша прыхільная чытачка.
...І вось (няўжо ўжо схлынула такое мора часу?!) у нашы дзверы (а ў сэрцы?) пастукала свята 65-годдзя Вялікай Перамогі.
"И я прошел по той войне..."
Я таксама ветэран Вялікай Айчыннай. І спахапілася... Хачу прапанаваць чытачам "Народнай Волі" сваё апавяданне "Белая варона". У кожнага была свая вайна.
Шчыра жадаю таленавітым і гераічным стваральнікам "Народнай Волі" і яе чытачам — Прастору і Волі!

Алена ВАСІЛЕВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ

Шаноўная Алена Сямёнаўна!
Шчыры дзякуй за прыхільнасць да "Народнай Волі" і ўвагу да яе. Зычым добрага здароўя і творчых сіл яшчэ на доўгія гады! Віншуем Вас, паважаная і мужная абаронца Радзімы, з 65-годдзем Вялікай Перамогі!
З задавальненнем друкуем Ваша апавяданне.

Алена ВАСІЛЕВІЧ

Белая варона

Апавяданне

Вечарам пазваніў Дзіма:

— Прывет, Настасся! — так паблажліва, карыстаючыся правам старэйшага брата, звяртаўся ён звычайна да малодшае сястры. — Ты не ведаеш, дзе гэта загуляла наша Муня-Мусенцыя?

— Дык яна ж учора атрымала ордэн!

— Я ведаю. Медаль. Нарэшце спадобілася.

— Ты не забег да яе — павіншаваць?

— Ды некалі было. Мы ж сваіх у інстытуце велічалі. Ветэранаў...

— І я ўчора ледзь жывая ўвалілася дадому. Ты ўяўляеш, на мяне сапхнулі ўсю нашу юбілейную самадзейнасць!

— Я думаў, можа, яна да цябе прыехала... Я, як учора яна пазваніла, зваў яе: давай, прыязджай, Мусенцыя, да нас. Замочым узнагароду! Не захацела.

— Яна была вельмі ўсхваляваная. І, вядома, чакала нас. Нядобра, Дзімка, што мы не выбраліся...

— Дзе тут усюды паспееш!

Так яны пагаварылі па тэлефоне. А назаўтра брату пазваніла ўжо Насця.

— Дзімка, Муня не падавала табе голасу?

— Не. Я днём званіў ёй, але тэлефон маўчаў.

— Дзімка, я пасля работы заехала да яе з кветкамі, але ў яе дзверы замкнутыя. На абодва ключы. Верхні яе ключ мы згубілі. Толік згубіў. І я не здолела зайсці... Ты ж ведаеш, на верхні ключ яна замыкаецца толькі нанач... У цябе ёсць абодва Муніны ключы?

— У мяне абодва.

— Дзіма, можа, ты зараз пад'едзеш?.. І я таксама прыеду.

— Што здарылася — ехаць апоўначы! Заўтра пасля работы я заеду абавязкова. А зараз яшчэ раз пазваню ёй.

— Дзімка, я толькі што званіла.

— Ну, ты ж ведаеш, што ўсе яны цяпер, усе гэтыя дні... Можа, стрэлася з кім-небудзь са старых... І ў госці да каго паехала.

— Якія госці! Як быццам ты не ведаеш, што Муня не любіць... Пазваню яшчэ раз.

Назаўтра раніцай тэлефон Муні-Мусенцыі зноў не абазваўся.

— Дзімка, я еду да Муні!

— Я цябе стрэну там, Настасся.

Муня. Муся. Мусенцыя. А то яшчэ Мусічак... Так яны звалі яе яшчэ з самага маленства.

***

Уначы Муні-Мусенцыі прысніўся дзіўны сон, нібыта яна згубілася ў Рыме, дзе ў сапраўднасці ніколі не была. Прыснілася, што яна адстала ад свае турысцкае групы і заўважыла гэта толькі ў тлуме Ватыканскага музея, каля скульптурнае групы Лаакаона...

Неверагоднейшая трансфармацыя: да вайны яшчэ яна вучылася і паспела скончыць два курсы мастацкага вучылішча. І вось трэба ж — праз дзесяткі год, здавалася б, ужо зусім забыты сусвет, дзе ўладарылі тварэнні бессмяротных, узнік у гэтым яе сне гэтакай дзіўнай явай.

Муню-Мусенцыю як громам ударыла! У гасцінічным нумары, у спешцы, яна забыла сумку з дакументамі і грашыма. І самае жахлівае — яна забыла назву гасцініцы, дзе спынілася яе турысцкая група і дзе павінна была жыць яна ў Рыме... А калі да ўсяго гэтага дадаць, што Муня-Мусенцыя не ведала італьянскае мовы — становішча і жах яе зусім не адрозніваліся ад Лаакаонавага і яго сыноў, здушаных гадзюкамі, насланымі на няшчасных разгневанымі багамі... Але за што было гневацца і караць багам яе, турыстку Муню-Мусенцыю, якая нават амаль набожна напілася з Траянавага акведука ў дворыку Ватыкана святой вады аквапіі... Яна стаяла, нібыта прыкутая нагамі да вытанчаных мармуровых мазаік — рымляне не слалі пад ногі дываноў, яны падагравалі падлогу і таму ўпрыгожвалі яе мазаікай — і сэрца яе ў гэтым усяленскім тлуме поўнілася безвыходнай адзінотай і жахам. Пачварныя гадзюкі, кожная таўшчынёй па добрай жардзіне, выгінаючы свае агідныя мускулістыя целы, прагна спаўзалі ўжо да яе ног... А яна, як гэта заўсёды здараецца ў сне, не здольная была ні скрануцца з месца, не мела голасу закрычаць, ні паклікаць каго на помач.

І раптам па ацалелай сярод антычных руін свяшчэннай дарозе, па якой праходзілі трыумфальныя шэсці рымскіх імператараў і па якой царыца Клеапатра на сланах уступала ў Рым са сваім сынам — нашчадкам Юлія Цэзара — раптам па гэтай трыумфальнай дарозе, як на іконе Георгі Пабеданосец, з узнятай угару пікай на белым кані з'явіўся маршал Жукаў... ("Таксама Георгі!" — паспела ў гэтым дзіўным сне ўспомніць Муня-Мусенцыя.) Мільганула ў паветры над пачварамі гадзюк вастрыё пікі і раздаўся грамавы голас:

— За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, за адданую службу і мужнае адданае сэрца прымі, дзева Марыя Агароднікава, узнагароду Радзімы!

І маршал Жукаў спусціўся з белага каня на зямлю і самаруча прышпіліў узнагароду да старэнькай картовай жакеткі, якую Муня-Мусенцыя (Маша Агароднікава) пранасіла амаль усю вайну...

І ў гэты ж самы момант — адкуль яны толькі ўзяліся! — Муню-Мусенцыю з абодвух бакоў абхапілі Дзімка і Насцечка, яшчэ малыя дзеці, абое ў школьнай форме, а Насцечка і ў белым святочным фартушку і белых капроновых бантах у косках. Яны адно перад другім наперабой штурхалі ёй у рукі кветкі, са смехам тузалі і кружылі яе на месцы, цалавалі. І яна цалавала іх і са смехам, шчаслівая, таксама кружылася разам з імі... І нават не заўважыла, калі знік на сваім белым кані маршал Жукаў і куды падзеўся той жахлівы Рым, у якім яна згубілася...

Муня-Мусенцыя прачнулася ад таго, што вельмі білася сэрца. Прачнулася ад жаху, што яна згубілася ў такой чужыне, гэтак далёка ад дому і ад усяго-ўсяго свайго, роднага... Ад такога дзівоснага з'яўлення маршала Жукава. Ад шчасця, што яе любыя дзеці былі з ёю.

А сэрца не сціхала, бухала нібыта молатам па грудзях, нібыта яму было цесна і яно хацела разамкнуць іх. Муня-Мусенцыя, па звычцы, працягнула руку па валідол на тумбачцы, паклала таблетку пад язык і, заплюшчыўшы вочы, пачала прыслухоўвацца і чакаць, калі яно нарэшце суцішыцца, перастане вось гэтак калаціцца і правальвацца ў балючую чорную бездань. Яна не тое каб баялася смерці. Страшна ёй было іншае: памерці вось так адной, сярод нямых сцен. Яна не памятала, дзе яна чытала ці чула ад каго: усе людзі паміраюць у самотнай адзіноце... Але каго гэта магло суцешыць?

Каб не даваць улады над сабой такому настрою, яна звычна адшукала рукою ўключальнік начное лямпы і запаліла святло. Неабходна было пераключыцца — лепш бы на чытанне... Усё роўна да раніцы ўжо не заснуць. Яна ўзяла з тумбачкі часопіс, які чытала звечара, і на вокладцы ўбачыла запісаны ёй тэлефон Андрэя Перагуда. Яна ўдзень яшчэ заказала міжгорад і, як заўсёды гэта рабіла, пазваніла яму, каб павітаць з надыходзячым святам. І з юбілейным, вядома, ордэнам.

Ён — колішні камсамольскі сакратар — сярод іх маленькай ацалелай жменькі старых сяброў па даваеннаму яшчэ мастацкаму вучылішчу — і да гэтага часу заставаўся ў іх вачах камісарам, партызанскім арлом. З палінялым, праўда, пер'ем ужо, без ранейшага размаху крыл, але ўсё роўна — арлом і камісарам! У іх вачах.

— Прывітанне!

— Прывітанне! — ён сам, як заўсёды, зняў трубку. — Як жыццё? Якія навіны?

— Якія ў мяне навіны... Вось званю, каб цябе павіншаваць.

— Дзякую. Збіраю сёння ветэранаў. Маленькую рэпетыцыю правесці... — Ён ніколі не сядзеў без занятку, без "рэпетыцыі". — Нас, брат, у Маскву, на юбілейны парад, ужо не ўзялі. Старыя, кажуць! — ён засмяяўся лёгка, без адцення нават крыўды ці старэчай буркаты. — Калі пераваліла, брат, за... Пойдзем стройнымі калонамі ў сябе дома!.. Хопіць з нас?

— Ды хопіць. І хапіла...

— Што праўда, то праўда — хапіла ўсяго!

— Ну, а Рэня як маецца?

— А нічога сабе маецца! У цырульню пайшла. Збіраецца заўтра таксама ісці медаль атрымліваць.

— Медаль? За што?

Муня-Мусенцыя нейкім толькі цудам стрымала свой язык: Рэня ўсю вайну праседзела з малым дзіцем як сям'я камісара партызанскага злучэння ў маскоўскай гасцініцы "Якар"...

— Як гэта за што? Як-ніяк яна ж мая жонка!

Ніколі нельга было зразумець: што за яго смехам — жарт ці насмешка.

— Ты гэта ўсур'ёз? Рэня ж нідзе не ўдзельнічала...

— Ну, як не ўдзельнічала... Яна ж была...

— Божа мой! А дзе ж і кім была тады я, варона?!

— Ты — белая варона! — задаволены сваім трапным вызначэннем, весела зарагатаў у трубку Перагуд. І, як толькі адзін ён умеў, адразу ж з жарту перайшоў на сур'ёзнае: — Значыць, так. За сорак гадоў ты не здолела... Не выбралася... А цяпер слухай вось што: зараз жа збяры ўсе паперкі (яны ў цябе хоць захаваліся?) і неадкладна, сёння ж, тупай у райваенкамат. Да самога ваенкома! Зразумела?

— Зразумела... Але што я скажу ваенкому?

— А ты нічога не будзеш гаварыць. Ты пакажы яму свае паперы! І ён сам усё ўбачыць... Якая ў цябе была вайна.

...Ваенком загадаў прыйсці да яго заўтра раніцай, і ў Муні-Мусенцыі заставалася дастаткова часу, каб успомніць, якая і сапраўды была ў яе вайна.

***

...Але ўспаміналася ёй чамусьці зусім іншае. Успаміналася, як вярнулася яна ў сорак чацвёртым, пасля вызвалення ўжо, пасля парада ў Мінску, з гадавалым Шурыкам. Вярнулася да роднае сястры, і як сястра ў першы ж вечар, ні словам нават не абазваўшыся, як і дзе кідалася яна ўсе гэтыя страшныя гады і адкуль прыйшла са сваім маленькім дзіцем, заявіла ёй, што ў яе і сваіх траіх няма чым карміць, не тое каб яшчэ клапаціцца пра партызанскае байстручаня. Сястра ўсю вайну пражыла з мужам-акружэнцам з кадравых афіцэраў. Яго і пасля вызвалення, ужо ў сорак чацвёртым, таксама не ўзялі ў армію. Ім такім — казалі тады — не было даверу. У сястры быў муж, і ў сястры былі законныя ад яго дзеці.

А ў яе мужа не было. У яе засталася толькі яго фотакартка — чамусьці дзяціная таксама. І застаўся адрас яго бацькоў у Ленінградзе. Сам Аляксандр Ягораў — бацька яе сына — загінуў у сорак трэцім, калі з баямі выходзілі яны з акружанага з усіх бакоў немцамі Станькаўскага лесу.

...А ёй памятаўся ён жывым. То як ездзілі яны разам па вёсках мяняць падбітых і раскаваных партызанскіх коней... То як разам хадзілі на жалезку... А то як пад новы, сорак трэці, у блакаду, суткі праляжалі ў снезе...

І дагэтуль застаўся ў памяці і сэрцы — нібыта ўчора гэта было! — яго смех: "Ах ты, мая Муня-Мусенцыя!"

...Добрыя людзі ёй параілі, і яна паехала з дзіцем у райана. І там ёй нават узрадаваліся: далі выкладаць у вясковай школе маляванне (якое, праўду кажучы, па тагачасным тарыфе ведаў не мела ніякай вагі) і ў дадатак яшчэ — па недахопу настаўнікаў — атрымала яна і гісторыю з геаграфіяй. Атрымала і каморку пры школе — колішнюю кухню ў хаце раскулачаных гаспадароў, якая да вайны яшчэ адышла пад школу. Так і Шурык гадаваўся тут, у гэтай — цераз дзверы ад класаў — кухні. Калі часам падаў з ложка ці чаго хацеў і сам не здолеў дамагчыся — узнімаў плач, і тады яна або сама выбягала суцешыць яго, або, калі была занятая тлумачэннем урока, пасылала каторую з дзяўчатак-вучаніц.

...Шурыку ішоў пяты год ужо, як яна ўсё ж адважылася. Напісала ў Ленінград. Сама, напэўна, не адважылася б, каб не таварышкі-настаўніцы. Таксама большасць удовы і бязмужнія... "Напішы і напішы!.." Шурык жа яе і той пяцігадовы ленінградскі Аляксандр Ягораў з фотакарткі (яна звала яго Шурык) былі падобныя як дзве кроплі вады.

— Сфатаграфуй хлопца і пашлі разам з пісьмом! Не можа быць, калі бацькі асталіся толькі ў тым Ленінградзе жывыя, каб не адгукнуліся!

І яна сфатаграфавала свайго Шурыка, напісала пісьмо і разам з фотакарткай адправіла яго па адрасе, які застаўся ў яе з таго, яшчэ блакаднага, Станькаўскага лесу сорак трэцяга года. ("На ўсякі выпадак вазьмі і захавай, Муня-Мусенцыя...")

...Гэта быў цуд не толькі на ўсю школу, а на ўсю тую вёску, а можа, і на ўвесь раён... На яе пісьмо з фотакарткай Шурыка прыйшоў Муні-Мусенцыі з Ленінграда не толькі адказ, а нават афіцыйны выклік прыехаць — тады ў Ленінград інакш паехаць яшчэ было нельга.

Так апынуліся яны з Шурыкам у Ленінградзе. За тры дамы ад Неўскага. Амаль побач з велічным Ісаакіем.

Сашавы бацька з маткай жылі ў двух пакойчыках цемнаватага цокальнага паверха. Разам з імі жылі яшчэ і дзве Сашавы сястры. Адна, старэйшая, незамужняя, і малодшая з мужам і двума маленькімі дзецьмі, народжанымі пасля вайны ўжо.

Гэта складаная і, па сутнасці, зусім чужая Муні-Мусенцыі сям'я прыняла іх з Шурыкам, як і трэба было спадзявацца, таксама з вельмі складаным адчуваннем. Маці, нібыта стрэла яна з вайны любага самага малодшанькага сына, гатова была на ўсе ахвяры. Бацька глядзеў на рэчы па-мужчынску цвяроза: сына ўжо не вернеш, а дочкам трэба жыць. У дачок яшчэ ўсё жыццё наперадзе. І дочкі, вядома, не былі ў захапленні ад наезду такой выпадковай радні... Аднак маці нічога і слухаць не хацела: усе яны выжылі ў блакаду (адзін толькі бог ведае, як яны выжылі!), а Саша (дома яго звалі Сашам) не вярнуўся... Дык як, як яны адмовяцца ад яго сына, ад маці яго сына! Як яны будуць глядзець людзям у вочы!

Сям'я Сашава ішла ад старой працоўнай, пецярбургскай яшчэ, дынастыі. І сям'я гэта не адвярнулася ад Шурыка і Муні-Мусенцыі. Шурыка адразу ж аддалі ў дзіцячы сад. А Муня-Мусенцыя (куды ёй было ў ленінградскую школу!) тэрмінова скончыла курсы і пайшла працаваць у трамвайны парк. Вадзіцелем. З трамвая і на пенсію выйшла.

А да пенсіі... Вайна і блакада сваё сплацілі. Першым, на сёмым годзе жыцця, памёр Шурык. Памёр ад прыроджанага пароку сэрца. Недзе праз год пасля Шурыка ад белакроўя памерла малодшая замужняя дачка, пакінуўшы двое малых сірот. Гэтых страт не вытрымалі і неўзабаве пайшлі адно за адным і маці з бацькам. Як касой сям'ю выкасіла.

Суседзі — спагадлівыя людзі — раілі маладому ўдаўцу: дзве слаўныя, таксама маладыя яшчэ, жанчыны побач — выбірай любую за жонку, а за маці дзецям сама кожная згодзіцца быць. І той і другой — не чужыя ж дзеці... А ўдавец сам сабе выбраў — трэцюю. Жанчын незамужніх хапала. І маладых, і немаладых... І як зачыніў за сабою дзверы, так ні разу больш і не паказаўся. Нават дзецям... Старэйшая незамужняя сястра нябожчыцы — цётка дзяцей — не адважылася без мужа, без бацькі на ўсё жыццё застацца ім за маці. Свайго ўласнага лёсу хацелася дачакацца. І дачакалася, стрэлася з неблагім чалавекам і зусім без шкадавання таксама пакінула самотныя сцены свайго запозненага дзявоцтва...

А ў Муні-Мусенцыі ў гэтых сценах заставалася ўсё на свеце: і яе лёс, і яе ўспаміны, і гэтыя няшчасныя, нікому не патрэбныя дзеці-сіроты. Ёй не было чаго асабліва чакаць, не было на што спадзявацца. Усё яе было з ёю.

Так і засталася яна з таго часу мамай Муняй-Мусенцыяй. А то яшчэ яны яе звалі, Дзімка і Насцечка, Мусяй або Мусічкам. Гэта ў хвіліны ўжо асаблівай пяшчоты, калі наперабой адно перад адным ціснуліся да яе на калені або ў пасцель пад коўдру. Ці калі хацелі падлашчыцца і нешта выпрасіць у яе... Звалі так, як і вырослі ўжо, калі і сваіх уласных дзяцей займелі.

***

— Дзімка, ну што Муня?!

Брат чакаў Насцю на пляцоўцы каля ліфта. Дзверы ў кватэру Муні-Мусенцыі былі прыадчынены.

— Ціха... — прыўзняў ён руку.

— Чаго ты такі белы?

— Ціха... — паўтарыў ён. — Ты толькі не палохайся...

— Што Муня?!

— Хадзем...

— Дзімка!..

— Ціха...

РЕЗОНАНС

«Все минется, а правда останется»

Хочу солидаризироваться с редакцией "Народной Воли" не только как журналист, но и как дочь фронтовика.

Мой отец Петр Иванович Бобков, 1918 года рождения, прошел все испытания, выпавшие на долю его поколения. Выпускник Ленинградского пехотного училища, 20-летним лейтенантом он попал на "незнаменитую" финскую войну. Во время одной из атак взвод, которым он командовал, попал под ураганный огонь. Тяжело раненого его отправили в тыл. Когда началась Великая Отечественная война, он командовал батальоном, оказался в окружении, был в партизанах, освобождал родную землю от гитлеровцев. Он умер более двадцати лет назад, но я и сейчас ощущаю горечь и боль его рассказов о том, какой война была в действительности. Папа прочитал все мемуары военных начальников, он вырезал из газет факты и подробности из воспоминаний очевидцев, выписывал цифры наших потерь и подсчитывал наши победы по каждому году войны. Если бы он был жив, в его папках наверняка появились бы публикации из "Народной Воли": материалы историка Игоря Кузнецова, воспоминания рядовых фронтовиков, партизан и людей, переживших оккупацию. Он хотел знать не только "свою" войну, но и войну, испытанную другими людьми. Так он шел к тому, что сам называл объемом нашей военной трагедии и нашей победы.

Узнав о пикетировании редакции газеты "Народная Воля" с транспарантами "Позор фальсификаторам истории!" и других надписях такого же рода, я вспомнила о том, что подобного рода акции — с участием ветеранов — устраивались против Василя Быкова, против фильма "Иди и смотри" режиссера Элема Климова и писателя Алеся Адамовича. Разница в одном: инициаторами якобы патриотического гнева были другие фигуры — коммунистические лидеры.

Мал и затаскан арсенал белорусских мозговедов от идеологии! Хоть бы надписи на транспарантах выверили, ибо, думаю, под лозунгом "Нацизм не пройдет!", который виден на фотографии, и мой отец подписался бы, и я сама. Нацизм, согласно словарю, то же, что и национал-социализм — политическое движение 1920—1940-х гг. в Германии, возглавляемое Гитлером.

Или имелось в виду что-то другое?

Уж извините, седовласые фронтовики и фронтовички, партизаны и партизанки (если, конечно, пикетировать приходил кто-то из вас) за собственную оценку этого события: организаторам сей провокации нет дела до ваших истинных чувств. Им нужны ваши действия ради своих нечистоплотных целей — не давать спокойно жить тем, кто не страшится писать правду о том, что было, и о том, что происходит у нас в стране в наши дни.

Есть людская память о войне — и тех, кто воевал, и тех, кто родился перед самой войной и перенес ее тяготы, как Илья Копыл, написавший о "своей" войне. Предлагаю это сделать каждому из ветеранов и сверстников Ильи Копыла, бывших в оккупации, эвакуации или угнанными с родителями в Германию. Это и будет коллективным вкладом в то, что мой отец называл объемом войны.

А насчет этой провокации... В трудный период травли Василя Быкова автор "Василия Теркина" Александр Твардовский прислал ему телеграмму со словами: "Все минется, а правда останется!".

Время работает на правду.

Алла БОБКОВА,
кинокритик, ветеран труда.

НЕЗАБЫЎНАЕ

Тры дарогі,

або Паклон табе, мілая мама!

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 года не ўсе мужчыны прызыўнога ўзросту трапілі адразу на фронт, многіх маладых хлопцаў адправілі ў вучэбна-стралковыя палкі ў Мінску і іншых гарадах. Там іх рыхтавалі на малодшых камандзіраў, сяржантаў. Даведаўшыся аб месцы іх знаходжання, маці прызыўнікоў, з "сідарамі" за плячыма, у якія клалі сёе-тое з харчавання, адпраўляліся пешшу ці на спадарожных грузавіках на спатканне з сынамі. Нават зімой, у мароз і сцюжу. Ведалі пра бедны тады салдацкі паёк у тыле. І мая маці, калгасніца з вёскі Боркі Слуцкага раёна, ірвалася да мяне.

У студзені 1945-га надвячоркам наша 18-я рота ПТР (супрацьтанкавых ружжаў) 42-га вучэбна-стралковага палка толькі што вярнулася са сталовай. 17-гадовым салдацікам далі на вячэру па 200 грамаў чорнага хлеба, тры лыжкі пярлоўкі, па драбку цукру і кубачак гарбаты. Такім быў і ранішні сняданак. На абед была місачка баланды з рыбных костак і тыя ж тры лыжкі кашы.

Нечакана днявальны па казарме паклікаў мяне ў капцёрку да старшыны роты Кадуліна. Капцёркай звалася зямлянка паблізу казармы, з печкай-"буржуйкай". Толькі зачыніў я за сабою дзверы, як насустрач — маці. Прытулілася да маіх грудзей са слязьмі радасці. Дастала з рэчавага мяшэчка небагатыя хатнія прыпасы — бохан хлеба, кавалачак сала, клінковы правялены сырок, хлебныя сухары...

На пытанне, як з яе аднавяскоўкай, што пагадзілася праведаць пляменніка, яны даведаліся, што мы служым ва Уруччы, маці адказала: ад нашага саслужыўца Федзі Масюка з суседняй вёскі Папоўцы. Яго з-за сухотаў тыдняў са два таму спісалі дадому...

Да павароту на шашу са Слуцка на Мінск іх давёз на санях мой малодшы брат. З паўгадзіны яны прастаялі, пакуль шафёр вайсковага грузавіка "студэбекер" не прытармазіў. Дапамог узлезці ў кузаў, прыкрыты зверху брызентам. Гадзіны праз дзве ці тры машына спынілася ў раёне таварнай станцыі Мінска. Шафёр платы не ўзяў, паказаў, у які бок ім трэба ісці да таго Уручча. Пешшу яны прайшлі праз увесь разбураны вайной горад і толькі пад вечар былі ля прахадной у ваенны гарадок. Іх прапусцілі, нават паказалі, дзе месціцца наша 18-я рота.

Маці з трывогай у голасе паведала, што ад старэйшага сына Тоні, прызванага ў дзеючую армію летам 1944 года, даўно не было трохкутнічка. Мусіць, сэрцам чула, што яго ўжо няма ў жывых. Пазней, пасля вяртання дадому, атрымала з ваенкамата паперку. Там значылася, што яе сын, 1925 года нараджэння, знік без вестак.

Сустрэча наша доўжылася нядоўга, старшына паклікаў у казарму. Маці з суседкай там і пераначавалі, а назаўтра раніцой паспяшаліся на выхад. Выйшлі на шашу за Мінскам — і зноў на спадарожнай машыне, ужо з адкрытым кузавам, дабраліся да Слуцка, адтуль — яшчэ дваццаць кіламетраў да вёскі на сваіх дваіх.

Яшчэ раз, ужо ў маі пасля Перамогі, калі нашу роту на грузавіках завезлі на далёкае ад гарадка поле, дзе мы пад рыдлёўку саджалі бульбу для вайсковай сталовай, маці, ужо адна, з'явілася там сярод дня. Гэта мяне і ўзрадавала, і здзівіла — як яна змагла дабрацца сюды? Аказваецца, няма перашкодаў для маці на шляху да сына, дзе б ён ні быў. Зноў на спадарожным грузавіку шафёр давёз яе да таго поля. Што запомніў я на ўсё жыццё — гэта матчыны горкія слёзы па зніклым на вайне старэйшым сыне. Толькі гадоў праз дваццаць праз вайсковы архіў у падмаскоўным Падольску давялося даведацца, што мой брат Антон Тычына загінуў смерцю храбрых 17 студзеня 1945 года ў вёсцы Южэфуў ля Варшавы, там і пахаваны... Я праводзіў маці да грузавіка ЗІС-5, яна даехала да Уручча, адтуль ужо, па знаёмым "раскладзе", — дамоў.

Трэцяя дарога маці да мяне, дэмабілізаванага ў сакавіку 1951-га матроса, які ў Слуцку з цяжкасцю адшукаў месца школьнага лабаранта, трагічна абарвалася ў снежні таго ж года. Зранку бацька наклаў на драбінкі з дзесятак бярозавых плашчакоў на продаж у Слуцку, бо калгас тады за працу грашыма не разлічваўся, толькі зернем і бульбай у канцы года. Маці, апрануўшыся цяплей, наважылася наведаць мяне і ўзяла торбачку з вясковымі прысмакамі. Села на тыя дровы — і паехала. Яшчэ было цёмна, на другім кіламетры ад вёскі пярэдняе кола трапіла ў глыбокую каляіну, воз нахіліўся — і маці ўпала потырча з яго. Праз васемнаццаць дзён яна памерла на 48-м годзе жыцця, пакінуўшы мужа і чатырох дзяцей.

Цяпер, на схіле свайго веку, калі стаю ля мамінай магілы, гляджу ў глыбокім роздуме на матчына аблічча, прыпамінаю яе дальнія, нялёгкія дарогі на спатканне са мною — і прашу даравацъ мне ўсё, чым я грашыў перад ёю.

Веру, даруе за шчырае пакаянне. А я, пакуль жыву, не перастану дзякаваць роднай і любай мамачцы, простай сялянскай гаротніцы, за вялікае сэрца і паўтараць: нізкі паклон табе, незаменная, незабыўная...

Міхаіл ТЫЧЫНА, ветэран
Вялікай Айчыннай вайны.

г.Слуцк.

МАЛОИЗВЕСТНЫЕ СТРАНИЦЫ

Кто был в небе более грозен...

Из всех мифов о начале Великой Отечественной войны этот — превосходство немецкой авиации в воздухе — самый абсурдный и укорененный, будто Люфтваффе захватило господство в воздухе с первых дней, уничтожив к полудню 22 июня 1941 года 900 советских самолетов на земле и 300 — в воздухе. Об этом, в частности, утверждали в своих мемуарах в послевоенный период и маршалы авиации, и общевойсковые начальники. Автор этой статьи тоже так считал.



Но вот что писал в первом томе своих "Воспоминаний и размышлений" (8-е издание, 1987 год) маршал Г.К.Жуков, тогдашний начальник Генштаба Красной Армии: "С 1 января 1939 года по 22 июня 1941 года Красная Армия получила 17.745 боевых самолетов, из них 3719 новых типов". А новыми были истребители Як-1, ЛаГГ-3, МиГ-3, штурмовик Ил-2, пикирующий бомбардировщик Пе-2, которые по своим тактико-техническим качествам не уступали немецким самолетам. Немцы же имели при нападении на СССР 3940 самолетов, из них истребителей Ме-109 — 1030, пикирующих бомбардировщиков Ю-87 — 369, остальные Ю-88, До-217 и Хе-111. Советская авиация имела в то время свыше 6000 истребителей, включая и И-16, и И-153, вооруженные четырьмя пулеметами винтовочного калибра, а некоторые И-16 и пушкой 20 миллиметров, способные в руках умелых пилотов сбивать немецкие самолеты.

Неслучайно военный российский историк Марк Соломин в своей книге "22 июня. Анатомия катастрофы", выдержавшей десятки переизданий рекордными тиражами, исследовав 199 изданий о войне советских, послевоенных немецких, английских историков и военачальников, а еще и сборник "Гриф секретности снят" под редакцией российского историка Г.Ф.Кривошеева, отвергает эти вышеупомянутые мифы. В главе "Огонь с неба" автор приводит воспоминания маршала авиации Н.С.Скрипко (в начале войны — полковник): "25 июня 1941 года советские 11-й и 6-й мехкорпуса нанесли по немцам контрудар в районе Гродно. Их поддерживали полки 12-й бомбардировочной и 43-й истребительной дивизий, а также 3-й корпус дальнебомбардировочной авиации ВВС Балтфлота, базировавшийся в Прибалтике. Авиаторы совершили 780 вылетов, уничтожили около 30 танков, 16 орудий и до 50 автомашин". Цифры взяты ими с воздуха — из отчетов самих летчиков, которые не всегда в то время были достоверными. Летчики полковника Н.С.Скрипко еще 24 июня совершили в районе Гродно 170 вылетов, 26 июня — 254! А результат был неутешительным, потому как танки генерала Готта уже 27 июня, преодолев за шесть дней 360 километров, были возле Минска, а на следующий день вошли в город.

30 июня 1941 года три бомбардировочных полка ВВС Балтфлота, а это были ночные бомбардировщики ДБ-3ф, способные нести 2,5 тонны бомб, но имевшие на вооружении лишь три пулемета винтовочного калибра, совершили 99 вылетов, дабы взорвать мосты и понтонные переправы немцев через реку Западная Двина. Летали без прикрытия истребителей и потеряли 34 самолета от зениток и немецких "мессеров", еще 5 машин совершили вынужденную посадку, 77 человек из состава летных экипажей погибли или пропали без вести. Но разрушить переправы на реке не смогли! Почему? Автор исследования поясняет и небезосновательно: бомбили мосты и переправы эти бомбардировщики с горизонтального полета, когда рассеивание бомб довольно высокое, хорошо, если из 100 бомб в цель попадала хотя бы одна или две.

Еще пример массового применения нашей авиации в начальный период войны, о чем упоминает автор книги. 28 августа 1941 года Сталин лично распорядился на Брянском направлении в течение трех дней силами фронтовой авиации и резерва Главного командования ударить по 2-й танковой группе генерала Гудериана силами 464 самолетов! Это при том, что к этому времени, по данным немецких послевоенных источников, Красная Армия потеряла около 8000 самолетов. Значит, резервы еще были. На танковые клинья Готта было нацелено 230 бомбардировщиков СБ, ДБ-3ф, в том числе и 30 пикирующих Пе-2, 55 штурмовиков Ил-2 и 179 истребителей. За 6 дней эта армада совершила 4000 самолетовылетов. Казалось бы, от танков Гудериана одни клочья остались. К сожалению, ущерб танковым клиньям был ничтожным, и они, пройдя за две недели с боями 300 километров, 15 сентября замкнули за Киевом "котел", в который попало 5 советских общевойсковых армий, после разгрома коих немцы только пленными взяли 665 тысяч военнослужащих. Как и в налетах возле Гродно в первые дни войны, те удары с воздуха на Брянском направлении не дали эффекта потому, что бомбометание под огнем немецких зениток и истребителей Ме-109 велось по площадям, даже новые отличные бомбардировщики Пе-2 использовались без входа в пике, потому как экипажи не были подготовлены к такому рискованному и сложному маневру и сбрасывали бомбы тоже с горизонтального полета. В то время как немецкие пикировщики Ю-87 могли пикировать под углом 90 градусов и класть свои пять 100-килограммовых бомб в круг диаметром 30 метров! В первые полтора года войны они наносили нашим войскам в обороне, в колоннах на марше, на железнодорожных станциях при разгрузке эшелонов очень серьезные потери, пока у ВВС не появилось достаточное количество новых истребителей Як-7 и Ла-5, способных легко расправляться с этими Ю-87, если те летели без прикрытия истребителей. Кстати, на Курской дуге немцы потеряли свыше 550 этих Ю-87. И немцы в конце 1943 года вынуждены были прекратить их выпуск. На смену им пришел штурмовик Ю-129, вооруженный двумя 37-миллиметровыми пушками и несший 400 килограммов бомб.

И тем не менее автор книги "22 июня. Анатомия катастрофы" приводит такие факты малоэффективности огня с неба. За всю войну потери советских средних танков Т-34 распределялись так: от огня артиллерии, в том числе и танковой, — 88 процентов, от мин — 8 процентов, от авиации — только 4 процента. Не исключено, что такое соотношение по потерям немецких танков было и от огня нашей авиации. Хотя к концу войны советские ВВС превосходили Люфтваффе в 3,7 раза и процент потерь танков от огня с неба мог быть и выше, особенно от штурмовиков Ил-2 и Ил-10.

Михаил КУТНЕВИЦКИЙ,
ветеран Великой
Отечественной войны.

Народная Воля
http://www.nv-online.by
11—13 МАЯ 2010 г.

Пастару мінскай царквы «Новае жыццё» Рэлігійнага аб'яднання абшчын хрысціян поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь Вячаславу Ганчарэнку можа пагражаць турэмнае зняволенне за псаванне зямель

Пра гэта паведаміў БелаПАН юрыст абшчыны Сяргей Луканін. Пасля шэрагу спроб улады спыніць дзейнасць царквы і запалохаць яе вернікаў, ужо відавочна, што ўлады метады не выбіраюць — задзейнічаюць усе магчымыя сілы.

Днямі да будынка царквы прыбылі больш як 10 чыноўнікаў на чале са старшынёй Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандрам Баравіковым. Раней прадстаўнікі прыродаахоўнага ведамства прад'явілі іск абшчыне на суму больш як 249 млн рублёў нібыта за забруджванне тэрыторыі царквы нафтапрадуктамі, сказаў юрыст. Паводле яго слоў, добраўпарадкаванне газона для дзіцячай пляцоўкі каля будынка царквы чыноўнікі расцанілі як "псаванне верхняга ўрадлівага пласта зямлі". *"Акрамя таго, абшчыну абвінавацілі ў арганізацыі аўтамабільнай стаянкі і пад'язной дарогі. Зрабіўшы замеры тэрыторыі, яны паехалі, не склаўшы ніякіх актаў"*, — адзначыў Луканін.

Чыноўнікі, прадоўжыў юрыст царквы, ніяк не рэагавалі на довады аб тым, што аўтастаянка і дарога існавалі на гэтым месцы задоўга да набыцця абшчынай будынка былога кароўніка ў калгаса імя Калініна. *"Усе гэтыя довады Баравікоў прапанаваў нам выказаць у судзе. Адмятаючы абвінавачанні ў прадузятасці, чыноўнік паведаміў, што царква не адзіная юрыдычная асоба, да якой мае прэтэнзіі экалагічнае ведамства. У якасці прыкладу старшыня камітэта назваў Мінскі маторны завод, да якога за псаванне зямель прад'яўлены іск на суму 15 млн рублёў. Аднак Баравікоў не растлумачыў, якім чынам царква магла нанесці прыродзе ўрон амаль у 17 разоў большы, чым цэлае прадпрыемства"*, — сказаў Луканін.

Паводле яго слоў, у канцы гутаркі Баравікоў параіў задумацца над тым, якім пакараннем у адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь можа пагражаць псаванне зямель, якое пацягнула нанясенне ўрону ў асабліва буйным памеры. Згодна з артыкулам 249 КК, псаванне зямель караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў. *"Такім чынам, царкву чакаюць некалькі судовых працэсаў, першы з якіх пачнецца 12 мая"*, — сказаў юрыст.

У названую дату ў Гаспадарчым судзе Мінска пачнецца разгляд справы аб спагнанні больш як 249 млн рублёў з царквы "Новае жыццё", распачатай па іску камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Справа ў тым, што ў канцы мінулага года супрацоўнікі камітэта выявілі сляды нафтапрадуктаў у пробах, узятых на праезнай частцы дарогі каля будынка царквы, і інтэрпрэтавалі гэта як забруджванне навакольнага асяроддзя. Як сцвярджае Луканін, пры адборы проб грунту не прысутнічалі панятыя і прадстаўнікі абшчыны. Тэрыторыя вакол царквы раней выкарыстоўвалася калгасам імя Калініна для сельгасвытворчасці, а затым на ёй размяшчалася несанкцыянаваная звалка прамысловых адходаў з каркасамі і рухавікамі аўтамабіляў.

Марат ГАРАВЫ, БелаПАН.

ХОЧАЦЕ ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — НЕ

Княгіню Вольгу перасадзілі...

У нумары за 30 красавіка ў матэрыяле "Монументальная показуха" наша газета расказвала пра праекты новых помнікаў, якія павінны з'явіцца ў Віцебску, і пра тое, чаму яны неадназначна ўспрымаюцца грамадскасцю і экспертамі.

Як высветлілася, пасля гэтай публікацыі аўтару скульптуры княгіні Вольгі давялося перарабіць скульптуру. Нагадаем, эксперты наракалі на тое, што помнік княгіні Вользе, які павінен з'явіцца на плошчы Свабоды Віцебска, быў занадта падобны да манумента заснавальнікам Кіева.

У выніку мінскі скульптар Уладзімір Слабодчыкаў "перасадзіў" княгіню з носа ладдзі, дзе яна стаяла зусім як сястра Кія Лыбедзь, у сярэдзіну.

Выпраўлены варыянт помніка канчаткова зацверджаны днямі на Радзе па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве пры Савеце міністраў.

Разам з Вольгай у ладдзі ў Віцебск "прыплывуць" ваяр, селянін, манах і дзіця.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Греции бояться не надо

Мы с семьей планировали в этом году отдохнуть в Греции, но сейчас в связи с забастовками и акциями протеста в этой стране не знаем, что делать. Может быть, "Народная Воля" могла бы прояснить ситуацию у туроператоров?

Полина Лугина, г.Минск.

За разъяснениями мы обратились в крупнейшему оператору по турам в Грецию, работающему не только в Беларуси, но и во многих странах мира, — кампании "Музенидис трэвел".

— В первую очередь, мы хотим успокоить тех, кто уже забронировал туры в Грецию на ближайшие месяцы. Нет никаких причин отменять путешествие. К сожалению, некоторые СМИ склонны преувеличивать сложность ситуации в Греции, приписывая внутренние греческие проблемы в сфере туризма. Подчеркиваем особо: то, что происходит сейчас с экономикой Греции, не имеет никакого отношения к туризму, а значит, не может отразиться негативно на отдыхе ваших и наших клиентов.

Увеличение налогов (одна из антикризисных мер греческого правительства), сокращение рабочих мест и "бонусов" касаются лишь работников государственных служб Греции и так называемых "бюджетников". С туристической сферой эти сложности не имеют ничего общего.

Несмотря на негативную реакцию многих европейских СМИ касательно положения экономики Греции, паника необоснованна. Уже в мае начались рейсы с прямыми вылетами из многих российских городов: тысячи отдыхающих спешат на открытие нового греческого сезона, к ласковому солнышку Греции. 6 мая успешно состоялся и первый рейс Минск—Салоники.

Более того, для отдыхающих в Греции новые меры греческого правительства по стабилизации экономики означают в первую очередь существенную экономию на отдыхе. Ведь уже с весны снижается стоимость многих услуг внутри страны, в том числе топливный сбор аэропортов, портовые сборы для транзитных морских круизов, стоимость проживания в отелях. Все это не может не сказаться позитивно на количестве приезжающих отдыхать в Грецию.

Кстати, белорусы активно бронируют отдых в Греции. Наши сотрудники отмечают, что туры фактически на весь май и июнь уже проданы. По предварительным результатам на начало сезона, лето 2010 года обещает стать более успешным для греческого туризма, чем лето-2009.

ПЕРСОНА

Пушкін

25 пытанняў мастаку, свабоднаму ад умоўнасцяў свету, але не свабоднаму ад свайго таленту

...Ён супярэчлівы, непахісны, нават жорсткі. Але і велікадушны, чулы, пакорны. Наш, беларускі, Пушкін — гэта грымучая сумесь, асабліва ў пачатку шляху. Вядомы ў вузкіх творчых колах, потым — у элітных колах праваабарончых арганізацый (грамадзянін-нонканфарміст!), а потым проста сярод "прасунутых" народных мас, мастак Алесь Пушкін памалу прыходзіць, на мой погляд, да той грамадзянскай і творчай пазіцыі, калі залатая раўнавага ў душы і ёсць галоўная праўда майстра. Хаця стартаваў калісьці, як ракета — строга вертыкальна і рашуча. Яшчэ за сваю дыпломную работу — роспіс "Парнат" у Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве (215 кв.м.) — быў адразу рэкамендаваны ў Беларускі Саюз мастакоў, удастоены вышэйшай адзнакі і пахвалы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Тут бы і карты — г.зн. пэндзлі — у рукі. Але не, у Пушкіна пачалася эпоха палітычных перформансаў... Перахварэў ён акцыямі пратэсту шалёна, ва ўсю моц сваёй таленавітай душы. Зарабіў славу стваральніка скандалаў, экстравагантнага чалавека, барацьбіта, нават хулігана. А слава жывапісца ледзь было не згасла. Але тым "ледзь" і адрозніваецца талент ад усіх астатніх: ён ведае, калі затрымацца, каб трапіць у мэту, якую пакуль ніхто іншы не бачыць. Зараз мастак піша вытанчаныя абразы і карціны. І гэта ўжо зусім іншы Пушкін... Мне падабаецца сённяшні. А вам?

1. **— Алесь, як вы можаце лічыць сябе нацыяналістам з такім прозвішчам? Нават у ім закладзены інтэрнацыяналізм.**

— Парадаксальна, так! Я нават люблю прадстаўляцца з гумарам: "Злобны беларускі нацыяналіст — Пушкін!".

2. **— Ці ведаеце свой радавод?**

— Дакладваю. Прапрадзед мой — Канстанцін Пушкін — жыў на пачатку XIX стагоддзя ў вёсцы Трасцянка каля вёскі Бобр. Прадзед Дамэнта жыў у самім Бабры і быў звычайным сялянінам: меў 3 га саду, араў зямлю, любіў гуляць у карты. Дзед Іван таксама жыў у Бабры. У Першую сусветную быў шараговым у войску, паранены ляжаў у Маскве ў шпіталі. Там іх, параненых і хворых на тыф, наведваў цар, і пра тое ёсць дакументы. Тата мой — Мікалай Пушкін — народжаны тут, у Бабры, у 1924 годзе, а памёр у 2007-м. Бачыце, паралельна з Пушкінымі ў Пецярбургу былі беларускія Пушкіны — звычайныя людзі. Ігар Пушкін з Магілёва, дырэктар краязнаўчага музея, выдаў у 1992 годзе артыкул "Белорусское ответвление рода Пушкиных".

3. **— Вы атрымалі добрую адукацыю: мастацкая школа імя Ахрэмчыка, Акадэмія мастацтваў. А як вы, уласна кажучы, трапілі ў школу для адораных дзяцей у Мінск са свайго мястэчка?**

— Тата. Ён! Валявым рашэннем... Быў у райцэнтры Крупкі конкурс малюнкаў. Прыехаў педагог з Мінска — выкладчык Пётр Пятровіч Шарыпа (ён і дагэтуль працуе ў школе). Праз некалькі тыдняў прыходзіць пісьмо: "Вы успешно прошли первый конкурс вступительных экзаменов..." Тата: "Паехалі! Будзеш маляваць Леніных-Брэжневых — хоць будзеш добра жыць. А то кім будзеш у калгасе? Як я, электрыкам, ці лесніком пойдзеш? У нас тут афарміцель ёсць, дык ён, калі заходзіць у краму, я бачыў, купляе аж два кіло цукерак самых лепшых!"

4. **— Вы не аказвалі супраціўлення?**

— Не, я любіў маляваць, натхнёны быў дзіцёнак. А мама заўпарцілася. Калі ўжо прыйшло пісьмо, што паступіў, яна кажа: "Так сорамна! У вёсцы, калі здаюць дзяцей у інтэрнат, дзяржаве, то лічаць, што яго бацькі лайдакі, п'яніцы! І што ў нас іх — пяцёра? Толькі двое дзяцей..." А тата на сваім: "Будзе мастаком — будзе клас!"

5. **— Як думаеце, у якія часы нарадзілася ваша грамадскае бунтарства? Здаецца мне, менавіта ў школе...**

— У школе, так. Першы бунт адбыўся ў 11-м класе ў 1983 годзе. Мы з таварышамі патрабавалі, каб маляваць у майстэрнях колькі хочаш, а не здаваць ключ у 9 гадзін вечара. Напісаў з таварышамі петыцыю супраць "самаўпраўства адміністрацыі". 13 пунктаў. Дырэктар спужаўся. Дазволілі нам працаваць. Гэта была маленькая перамога! Але потым, калі паступаў у Тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Акадэмія), у маёй характарыстыцы было напісана: "Бывает резок, груб в обращении со взрослыми. Создает конфликтные ситуации..." Але далей, на першым курсе, я быў ніжэй травы, абсалютна апалітычным. Ціхі. Толькі маляваў. Чытаў шмат... Потым забралі ў войска на два гады.

6. **— Ведаю, вы апынуліся ў Афганістане, але лёс да вас быў літасцівы: забіваць людзей вам не давялося, так?**

— Я абслугоўваў верталёты, чапляў касеты з НУРСамі, бомбы да іх... Ахоўваў, даваў зводку надвор'я, прымаў карты... Літасцівы лёс, бо, як мовіў тата, мама дужа многа малілася. Мама заўсёды была веруючым чалавекам. Вось яе партрэт напісаў. Лёс жанчыны, яе свет: кароўка, дзеткі. Побач — арабіна — не вельмі добры лёс жаночы... Муж — сатрап, так... Калаціў яе, калі добра выпіваў. Гэта была вялікая траўма для мяне... Пасля вайны маці збірала смалу ў гумовых ботах, застудзіла суставы, застудзіла ногі. Поліартрыт — стала інвалідам 1-й групы. Пенсію аддавала мне, каб вывучыць. А ў войску я спачатку быў у Валгаградзе, у вучэбцы па падрыхтоўцы малодшага авіяцыйнага персаналу — гэта тэхнікі і механікі па ўзбраенні верталётаў, самалётаў. Потым нас размяркоўвалі па ўсім Варшаўскім дагаворы: у Польшчу, Германію, Кубу. Мяне — у Афган, як самага ўпартага. Я ўжо тады быў свядомы — дзённік пісаў на беларускай мове! Накіравалі спачатку ў Туркестанскую ваенную акругу і 5 лістапада 1984 года — запомніў на ўсё жыццё — у Афган. На перасылцы паглядзелі дакументы: мастак? Маляваць можаш? Я: "Не! Акцёр!" Каб Леніна ў штабе не маляваць, сказаў, што я акцёр... Ідэйны быў! Я ж рукі не падаваў мастакам, якія Леніна малявалі! "Да ты что, молокосос, он нас кормил! — абурана казалі яны. — Пожил бы ты... Это же сейчас — перестройка!" Не, прабачце...

7. **— Многія кажуць, што менавіта ў Афгане вы набылі душэўную траўму, што сталі такім радыкальным у паводзінах. Як лічыце?**

— Гэта так. І траўма, лічу, звязана з беларусам, прапаршчыкам Бельскім. Ведаеце, што такое савецкі салдат у Афганістане? Марадзёр. Напрыклад, у краме (дукане — па-афганску) выстаўляецца наперад аўтамат і забіраецца з полак усё, што хочаш. Я пісаў аб гэтым у дзённіку... І прапаршчык Бельскі, беларус, прачытаў без дазволу мой дзённік! Вядуць мяне да начальніка штаба палка. Да рускага, масквіча, маёра Кулікова... Ён гаворыць: "В вашем дневнике содержатся записи, которые идут вразрез с политикой партии и Советского государства в Афганистане — 10 сутак гауптвахты!" Вельмі ўразіў мяне беларус Бельскі тады... Сваім перакладам і даносам...

8. **— Абвостранае пачуццё справядлівасці гаворыць аб тым, што вы не раз адчувалі сябе ў меншасці, як бы абыдзеным увагай, так?**

— Але ў 1987—1989 гадах пачаліся цудоўныя падзеі. На канікулах, "лежачы на печы", прачытаў гісторыю БНР, з'ездзіў у Вільню, дзе ўбачыў лозунгі "СССР — тюрьма народов", іхнія нацыянальныя сцягі. І я вырашыў таксама, як у літоўцаў, намаляваць плакаты, зрабіць перформанс. Якраз "Дзяды-1988" падышлі. Такія падзеі пачаліся! Пачаў пісаць "Карціну свабоды" — алегорыя змагання. Што тут дрэннага? Легенда пра паходжанне нашага сцяга: паміраючы воін правёў крывавай рукой па белай кашулі, і людзі ўбачылі ў гэтым сэнс і паднялі палатно як свой сцяг... Я ўзяў палатно памерам два на метр, 300 грамаў уласнай крыві, прыклаў руку, атрымалася карціна, намаляваная крывёю. Я выставіў яе потым у Палацы мастацтва на першай маладзёжнай выставе.

9. **— Якія былі водгукі? Хоць гэта было ў духу часу...**

— Пётр Краўчанка, тады ён быў першым сакратаром гаркама партыі, у кнізе водгукаў запісаў: "Пушкин, лучше бы тебе быть донором, а не художником!" Потым яму самому было цікава ўспамінаць...

10. **— Пачатак быў азартны. Але потым з'явілася ў вас агрэсія, злосць у некаторых учынках. Вы згодны?**

— Максімалізм — першая мая велічэзная памылка. На з'ездзе беларускіх суполак у 1988 годзе, у Вільні, ляпнуў, начытаўшыся прапаганды Бегуна: "Я не палітык, я проста студэнт, але мару аб Беларусі без жыдоў і камуністаў!" Усё! Гэта так распісалі... Паўплывала на мой лёс капітальна. Прайшло ўжо гадоў колькі, і калі "Нашай Ніве" я даваў інтэрв'ю ў 2004 годзе, то павінен быў казаць: "Я цяпер мару пра Беларусь з жыдамі і камуністамі. Таму што жыды з'ехалі, камуністы не ва ўладзе, а ў Беларусі няма свабоды. Не яны нам перашкаджалі!"

11. **— Вы згодны, што любая рэвалюцыйнасць — гэта насілле?**

— Так, я рабіў памылкі недаравальныя... І апломб, і максімалізм, і наогул само залазанне ў палітыку для мастака дрэнна заканчваецца. Я разумею, што абавязаны, як беларускі інтэлігент з глыбінкі, мець грамадзянскую пазіцыю, культурніцкую пазіцыю — маляваць беларускія тэмы, размаўляць на мове. Але палітыка... Дагэтуль мне адгукаецца мая рэвалюцыйнасць: прыязджаюць журналісты, іх не цікавяць мае карціны. Анджэй Фідык зняў дакументальную стужку пра мяне. Ён здымаў пра багатыра (папольску — героя), які жыве і "валчыць", як ён казаў, супраць Лукашэнкі. Яму не трэба было ні маёй творчасці, ні маіх фрэсак... Толькі перформансы...

12. **— Як думаеце, якая эпоха лепш за ўсё адпавядае вашаму творчаму настрою?**

— Ведаеце, я зараз вельмі-вельмі паспрабаваў бы не ўдзельнічаць у палітычных мітынгах і шэсцях, бо правадыры гэтых шэсцяў выклікаюць цяпер расчараванне... Шчаслівая эпоха была — мастацкая школа, пачатак мастацкага інстытута.

— А з гістарычнай, мінулай эпохі?

— Тады 1918—1921 гады. Толькі пачыналася будаўніцтва нашай дзяржавы, і ўявіце, у тыя часы добра было б замахнуцца і напісаць велічэзную карціну 5 на 2 метры! Тое, што зрабіў Ян Матэйка ў Польшчы амаль на стагоддзе раней. У нас у гэты перыяд рэдкія мастакі — Сяўрук, Сергіевіч — нешта больш-менш зрабілі годнае. І то... Вось архітэктура была: Мінск у 20—30-я гады будаваўся, Вільня, Пінск — вельмі прыгожы. А жывапісу манументальнага не было! Вось я шкадую, што не жыў у тыя часы з адукацыяй, якую маю зараз. Я бы адразу ўзяўся за вялікі памер, грандыёзныя задачы — раніца нашай новай дзяржавы! І меў шанец застацца ў гісторыі выяўленчага мастацтва. А цяпер паспрабуй пасля Савіцкага, Кішчанкі, яго вялікіх габеленаў, пасля графікаў, якія ўславілі нашу рэспубліку на міжнародных выставах, пасля Селешчука і маладога цудоўнага Паўла Татарнікава!.. Раманаў няма, твораў грандыёзных няма...

13. **— А што вам зараз перашкаджае ўзяцца?**

— Я пішу! "Карціна Свабоды". Дваццаты год ужо. Канцэпцыя вельмі простая. Цёмныя фігуры, у якіх толькі вочы свецяцца... Але ў правым верхнім куце з'яўляюцца святло і сцяг. І трубы з гэтага святла выходзяць. І ў іх вялікія вочы. Раней, чым свабода прыйдзе на Беларусь, карціна не можа быць закончана. Але з кожным годам святла з правага верхняга кута становіцца памалу больш...

— Відаць, у мастацкім музеі вам не хутка яе прыйдзецца ўбачыць!

— Пакуль адмаўляюць...

14. **— З кім з гістарычных персанажаў хацелі б паразмаўляць?**

— З Язэпам Драздовічам. Я чытаў дзённікі, глядзеў работы, каб вызначыць: ён вар'ят ці ўсё ж такі геній? Ну і цікава было б пагаварыць з Пятром Машэравым. На яго праўленне прыпадае росквіт мастацтва і літаратуры, падтрымка іх дзяржавай.

15. **— А хто з сучаснікаў выклікае непадробленую цікавасць?**

— Гаўрыіл Харытонавіч Вашчанка, настаўнік... Міхаіл Савіцкі. Вялікую цікавасць адчуваю ад гэтага дзіўнага, парадаксальнага ў нечым чалавека. Мы з ім аднойчы ў 2005 годзе чатыры гадзіны размаўлялі.

— Дык ён жа супрацьлеглых з вамі поглядаў!

— На жаль. Таму і цікавы! І тым не менш. Адзінокі чалавек. Але свабода яго дасягнула такога ўзроўню, што ён гаворыць усё, што думае.

16. **— Чаму вы развіталіся з Партыяй БНФ?**

— Зараз раскажу. Калі Зянон Станіслававіч Пазьняк з'ехаў з Беларусі, Партыя БНФ раскалолася. Вельмі сумна, але пачаўся развал партыі... І потым: чаму няма сяброўскіх унёскаў у Партыю БНФ? Чаму зроблена стаўка на замежную дапамогу? Лукашэнка мае рацыю: палітычная партыя павінна падтрымлівацца сваім народам! Партыя Жырыноўскага і Зюганава, напрыклад, існуе на ўнёскі — рэальны рускі народ забяспечвае свае партыі. Гэта заўсёды выклікала ў мяне пратэст: чаму не збіраеце ўнёскі? Чаму робіце стаўку не на фермераў, не на простых грамадзян? Хоць 5 долараў у месяц!.. А калі ў цябе 5 тысяч сяброў, то можна і офіс зняць, і газетку выдаваць. І зарплату сакратарцы і сабе плаціць. А там ужо, хто ахвяруе, хто як... А то людзі гавораць: а-а, гэта апазіцыя, якую "содержит" Захад... Бясконцыя папрокі... Мая жонка Яначка таксама падпісала заяву аб выхадзе: "Як нітка за іголкай, так і я за мужам..." Так што мы беспартыйныя з 2001 года.

17. **— Калі б вы сталі кіраўніком дзяржавы, якое рашэнне было б першае?**

— Некарэктнае пытанне. Шаблон. Чаму сціплага вясковага мастака пытаюць аб гэтым?

18. **— Як да вас ставяцца вяскоўцы? У сталіцы ясна: вы — мастацкая персона, вам даруюць экстравагантнасць, вамі захапляюцца...**

— Тут, у Бабры — з падазронасцю. Усё-такі думаюць, што я хачу ўлады. Вельмі дзіўна! Калі распісваў царкву, дужа любілі бабулькі мяне. Кожнае царкоўнае свята, пакуль я працаваў над фрэскамі, сядзела сумленная бабулька і збірала ахвяраванні на фарбы: ад рублікаў да 100 долараў — адзін дзядзька даў. Народным спосабам збіралі на роспіс царквы. Я не прасіў. Народная ініцыятыва. Дужа любілі... А калі праз два гады ў 1999-м я з тачкай гною прыйшоў да Адміністрацыі Лукашэнкі, тыя ж бабулькі плявалі ўслед, калі я ішоў. Гаварылі: "Каб цябе на той свет вазіла, як ты нашаму прэзідэнту тачку вазіў!" Рэзка гаварылі мне.

19. **— Тачка гною... Як нарадзілася гэта ідэя?**

— Калі я зразумеў, што чалавек мяняе пад сябе Канстытуцыю, я ўспомніў часы СССР: як 8 чалавек выйшлі на Красную плошчу, супраць уводу войск у Чэхаславакію. Аднак я не хацеў палітычную справу рабіць — гэта не маё. А перформанс — іншая справа. Атрыбуты прадумаў: вазок, пальчаткі, кашуля, васількі, плакат, вілы...

— Хутка схапілі?

— Адразу ж... У аддзяленні здымаюць на відэакамеру і пытаюць імя. Я адказваю парасійску: "Имя мое неизвестно, подвиг мой бессмертен!" — "Ах, гад, мы и так знаем, что ты Пушкин!" — "Не, не скажу! Можа, Дастаеўскі?" Пасмяяліся. Потым быў допыт сур'ёзны: вы, маўляў, мастак, у Бога веруеце. А калі так, як вы, тэрарыст у цэнтр Мінска прыйдзе? Дакладвайце, як арганізавалі паездку! Потым суд. Два гады ўмоўна.

20. **— Як здарылася, што пачалі пісаць іконы? Тут, на маю думку, азарэнне патрабуецца...**

— Я лічу, трэба адраджаць беларускі іканапіс. Мэты мяняюцца. У мінулым годзе ладзіў у Оршы выставу ў музеі Караткевіча. У дзяржаўнай установе, прыйшлі нават чыноўнікі. Заўважце, 2009 год — вельмі важны для мяне: я змог выязджаць за мяжу, таму што мінулай вясной, 25 сакавіка, мяне першы раз не арыштавалі. Вось і афіцыйная выстава ў Оршы. І наогул — нешта мяняецца. Латушка прыйшоў, ці што?..

21. **— Самыя запамінальныя моманты дзяцінства?**

— Калі мы з мамай у спёку варочаем сена. Мама маладая, я маленькі... І адчуванне поўнай абароны. Сена пахне душыста. Альбо тата едзе са мной у лес за дровамі... Пах ягонай цыгарэты дагэтуль адчуваю.

22. **— А што вам імпануе ў людзях?**

— Па-першае, я падзяляю жанчын і мужчын. Вера і прынцыповасць — у мужчыны. Калі чалавек узяўся за які-небудзь гуж — мастацкі альбо палітычны ці жыццёвы, сямейны — і, згодна са сваімі поглядамі, чэсна пачынае ісці адной дарогай усё жыццё, — як яго не паважаць? Я сябрую з пракурорам — 42 гады ў яго стаж. Ён ужо ў адстаўцы. Як ні дзіўна, аб усім можна з ім пагаварыць. Я бацьку таго не казаў, што яму.

А ў жанчыне імпануе беларускасць, грамадзянская пазіцыя, якую яна павінна падзяляць з мужам. Вось пройдзе маладосць, наступіць імпатэнцыя, дзеці раз'едуцца, што будуць рабіць разам два старыя чалавекі? Тут важна духоўная блізкасць, як у нас з Яначкай. Яна гісторык, вясковая настаўніца, мая аднадумца.

23. **— Вы, здаецца, другі раз у шлюбе?**

— Не! З Маргарытай мы проста сустракаліся. Я працаваў у Магілёве, Маргарыта жыла ў Мінску. 1991 год. Ёй 38 год, мне 26. Які ж шлюб? Я чэсна гаварыў аб гэтым з Рытай. Мяне ў 13 год з сям'і аддалі ў школу-інтэрнат, потым армія, і ў мяне ўсе першыя жанчыны былі старэйшыя — замест мамы, відаць. Я доўгі час абсалютна не ўспрымаў маладых дзяўчын. Але ў нас з Маргарытай атрымалася дзіцятачка. Дачка вучыцца зараз у Інстытуце імя Шырокава на дызайнера. Я заўсёды з ёю сустракаюся, калі бываю ў Мінску. Дапамагаю маляваць, плануем нават праект агульны зрабіць.

24. **— Колькі вы можаце не працаваць, гультайнічаць?**

— Максімум — святы. Два дні Вялікадня. Альбо Новы год і Каляды — тыдзень. Потым з радасцю бягу ў майстэрню. Мне "мала" трэба — палотны, падрамнікі, фарбы, рамы. Дзе такога інвестара знайсці? А я б пісаў і пісаў.

25. **— А каб пачаць пісаць карціну, якія патрабуюцца ўнутраныя ўмовы?**

— Цішыня... Пакой у душы.

Алена МАЛОЧКА.

З ДАСЬЕ «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Алесь Мікалаевіч Пушкін (Пуша) нарадзіўся ў 1965 годзе ў мястэчку Бобр Крупскага раёна. Скончыў Тэатральна-мастацкі інстытут (зараз Акадэмія мастацтваў). З 1986 г. пачаў выстаўляцца на розных рэспубліканскіх штогадовых выставах у Палацы мастацтва ў Мінску. У 1992—1996 гг. зрабіў фрэскі ў Магілёўскім Архікатэдральным касцёле. У тыя ж гады — роспіс царквы Святога Міколы Цудатворцы ў м.Бобр Крупскага раёна. Лаўрэат Другой Нацыянальнай прэміі "Хартыя'97" у галіне абароны правоў чалавека ў намінацыі "За смеласць у творчасці", 1999 год.

Працы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, гарадскіх карцінных галерэях Оршы і Полацка, зборах Беларускага рыцарскага клуба, прыватных зборах Беларусі, Расіі, Латвіі, Нямеччыны, ЗША, Фінляндыі, Літвы і Польшчы.

Жыве ў весцы Бобр. Выхоўвае сына і дачку.

«ЗОРКІ» Ў ГАСЦЯХ У «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Анастасія НОВІКАВА:

«У Егіпце арабы за мяне давалі 200 вярблюдаў плюс сувеніры»

Бронзавая прызёрка пекінскай Алімпіяды, сярэбраная — чэмпіянату свету, пераможца чэмпіянату Еўропы па цяжкай атлетыцы Анастасія НОВІКАВА распавяла "Народнай Волі", як яе хацелі купіць у Егіпце арабы, які рамонт будзе рабіць у сваёй новай кватэры і чаму яна не кідае такі "нежаночы" від спорту.

— Пасля чэмпіянату Еўропы, які нядаўна праходзіў у Мінску, з'ездзіла на два тыдні ў Адэсу, адпачыла каля мора. У мінулую суботу ўжо пачаліся зборы...

— Не халаднавата для мора?

— Дык цяплей жа, чым у нас. Ды і паветра там іншае, для здароўя больш карыснае. Тым больш знаёмыя даўно ўжо туды запрашалі. А хто ж ад запрашэння адмаўляецца? Вось і рушылі невялічкай кампаніяй — камандай Мінскай вобласці. А ўжо больш грунтоўны адпачынак на моры прыбераглі на іншы час. Пасля таго, як у верасні пройдзе чэмпіянат свету.

— Пасля мінулага чэмпіянату свету, наколькі я ведаю, вы ездзілі на адпачынак у Егіпет…

— Так, усё было няблага. З'ездзіла ў Каір на піраміды, па поўнай праграме экскурсія. Піраміды, натуральна, уразілі, а вось тое, што вакол іх, — гэта проста шакіравала. Кучы смецця, горад брудны...

— Арабы любяць чапляцца да славянскіх дзяўчат. Вам шлюб не прапаноўвалі?

— Была справа. Пры гэтым перамовы вялі з маёй мамай; ведаю, што ёй за мяне давалі 200 вярблюдаў і плюс сувеніры. Карацей, у сваім стылі. Вясёлы народ.

— А вам якія хлопцы больш падабаюцца — паўднёвыя ці айчынныя?

— На Поўдні таксама ёсць прыгожыя мужчыны, і яны нават, можа, больш прывабныя за нашых. Але надта ўжо тэмперамент у іх б'е праз край — славяне больш спакойныя ў гэтым плане.

— А ваш ідэал мужчыны?

— Як такога няма, бо, на мой погляд, усё залежыць ад лёсу. Як павернецца — так павернецца.

— Замуж пакуль не збіраецеся?

— На першым плане ў мяне пакуль трэніроўкі і спаборніцтвы. Усё астатняе — на другім.

— А як жа кватэрнае пытанне?

— Кватэрнае пытанне вырашана напалову. У тым плане, што пасля Алімпіяды ў Пекіне аднапакаёўку я ўжо атрымала, а вось давесці яе да розуму пакуль няма часу.

— Дызайнера будзеце запрашаць ці самі складзеце дызайн-праект?

— Толькі сама. Я і ў сваёй кватэры ў Жодзіне ўвесь дызайн сама прыдумала. Люблю прастор. Дарэчы, я закончыла не толькі універсітэт фізкультуры, але і курсы дызайна. Але ж глабальна займацца гэтым проста не хапае часу. Трэніроўкі, спаборніцтвы, трэніроўкі...

— Легендарны балгарскі трэнер Іван Абаджыеў выказаўся не так даўно ў тым плане, што жаночую цяжкую атлетыку трэба не толькі выключыць з алімпійскай праграмы, але і ўвогуле знішчыць як з'яву. Маўляў, жанчыны створаны для кахання, а не для таго, каб падымаць "жалязякі"…

— Кожны мае права выказвацца так, як яму хочацца. Але я заўважаю, што з кожнымі спаборніцтвамі колькасць прадстаўніц у цяжкай атлетыцы становіцца ўсё больш. Мой першы трэнер расказваў, што пасля прайшоўшага чэмпіянату Еўропы ў Мінску дзяўчаты сталі самі прыходзіць трэніравацца. І ніхто ж іх не прымушае гэта рабіць. Кожнаму сваё, разумееце. Тым больш што жанчыны асвоілі ўжо практычна ўсё. Чаму ганебна, што я на спаборніцтвах падымаю штангу, але ніхто не кажа, чаму нашы жанчыны працуюць у "ліцейках"? Там што — больш лёгка?

— Затое кажуць, што для дзяўчыны цяжкая атлетыка — не самы эстэтычны від спорту…

— Не ведаю... У любым відзе спорту фотакарэспандэнт можа падлавіць момант, калі ў спартсменкі перакошаны ад напружання твар. Калі гімнасткі пырхаюць па дыване і ўвесь час усміхаюцца, то гэта не азначае, што ў іх няма катаржнай працы. Адным словам, я лічу так — калі чалавеку дадзены талент праявіць сябе ў нечым, то ён павінен выкарыстаць гэты шанц.

— У 2008 годзе ваша мама расказвала мне, як яна адгаворвала вас ад цяжкай атлетыкі, як прасіла кінуць гэты від спорту… Змірылася ўжо?

— Дык калі яна прасіла? Калі я платна вучылася ў тэхнікуме, а трэнер запрасіў мяне трэніравацца. Натуральна, маме было крыўдна, што грошы заплацілі, а працаваць я не пайшла. Тады з ёй і я размаўляла, і трэнер тлумачыў, што ўсё з часам, як кажуць, акупіцца. Зараз у гэтым плане аніякіх праблем і забаронаў няма.

— Анастасія, а як вам выпадак, калі ў мінулым годзе 22-гадовая чылійская цяжкаатлетка нарадзіла дзіця падчас трэніроўкі, а да гэтага нават не здагадвалася, што цяжарная?

— Можа, яна вагу вялікую мела. Ведаю, што ў такіх людзей расце жывот, і яны нават не заўважаюць, што цяжарныя.

— Але ж ёсць яшчэ жаночая фізіялогія…

— Відаць, так тая спартсменка ў свае 22 гады і разбіраецца ў той фізіялогіі. Галаву трэба мець на плячах — тады ўсё будзе атрымлівацца. І ў асабістым жыцці, і ў спорце.

Алесь СІВЫ.

ЗДАРОЎЯ!



Эдуард Малафееў ізноў ідзе ў бой

7 мая з бальніцы, на радасць балельшчыкам, выпісаўся вядомы футбольны трэнер Эдуард Васільевіч Малафееў.

Нагадаем, што 67-гадовы Эдуард Малафееў, які ў сёлетнім сезоне ўзначальвае салігорскі "Шахцёр", раніцай 26 красавіка быў шпіталізаваны з дыягназам "арытмія".

24 красавіка "Шахцёр" пацярпеў першае паражэнне ў чэмпіянаце, саступіўшы на выездзе дэбютанту, бабруйскай "Белшыне". Эдуард Васільевіч, напэўна, у літаральным сэнсе прыняў гэта паражэнне блізка да сэрца.

"Перамога саперніка законная, а па сваёй камандзе магу сказаць, што хлопцы слухаюць не толькі мяне аднаго, — сказаў пасля таго матча Эдуард Малафееў. — *Мне не хочацца рабіць нейкія версіі, але многія не гуляюць на поўную моц. І гэта мяне крыўдзіць, гэта страшэнная бяда для мяне! Чамусьці атрымліваецца, што перамога аказваецца патрэбней саперніку, чым нам, і гэта ўжо не першы матч такі. Гэта для мяне такі вялікі сорам! Яшчэ два-тры такія матчы — і ў мяне сэрца не вытрывае. Так не гуляюць у футбол!"*

— Так, была арытмія, але сёння *(7 мая. —* **Аўт**.) Эдуарда Васільевіча ўжо выпісалі, — распавяла "Народнай Волі" жонка Эдуарда Малафеева Дзіна Антонаўна. — А ўжо праз дзень — ізноў за работу, ізноў у бой. Урачы абследавалі, падлячылі, зараз усё нармальна.

— Трэба берагчы здароўе…

— Натуральна, што трэба, але ж муж інакш не можа. Ад натуры нікуды не дзенешся. Чалавек эмацыянальны, працуе так, як у маладыя гады, — з раніцы і да позняга вечара. І, безумоўна, вельмі перажывае за сваю справу. Такі ўжо чалавек...

Алесь СІВЫ.

«ЗВЕЗДЫ» — В ГОСТЯХ

Владимир САМСОНОВ:

«В Испании пресса не выстраивается ко мне в очередь за интервью...»

На днях в Минске прошел Открытый чемпионат Беларуси по настольному теннису, которым не побрезговал и Владимир Самсонов — "звезда" мирового настольного тенниса и нечастый гость у себя на родине. Именитый спортсмен рассказывал журналистам не только о спорте...

— Сейчас очень много времени провожу в разъездах, — признался именитый спортсмен "Спортивной панораме". — Живу в Испании, выступаю за российский клуб, плюс поездки на турниры. При таком графике вырваться на родину просто нереально. Вот сейчас приехал на чемпионат, а заодно получил возможность встретиться с папой, сестрой, племянницей, с друзьями.

— В Испании прижились?

— Переехали в Гранаду полтора года назад, когда подписал контракт с тамошним клубом. Через год получилось так, что из-за финансовых проблем клуба пришлось искать другое место работы. Выбрал Россию, Оренбург. При этом основной тренировочный процесс у меня по-прежнему в Испании, клубто там остался, а значит, и все условия для подготовки. В Оренбург чаще всего прилетаю только на матчи. Правда, перед важными встречами готовимся все вместе несколько дней.

— Как растут ваши мальчишки? К спорту приучаете?

— Старший играет в баскетбол. Он очень высокий — на голову выше сверстников. Тут и мои гены, и жены — у ее брата рост два метра. Вид спорта сыну нравится, занимается с удовольствием. Младшему еще только 4 года, он пока больше проказничает.

— Если сыновья выберут своей профессией большой спорт, не будете отговаривать?

— Не вижу в этом ничего плохого. Конечно, надо будет смотреть, какова перспектива в спорте, как с учебой, и тогда решать, на что делать упор. А вообще, занятия спортом для ребенка — это очень здорово.

— Ваши дети растут в интернациональной семье, которая к тому же путешествует по миру. Сколькими языками владеет ваш старший сын?

— В свои восемь с половиной лет — четырьмя. Когда жили в Бельгии, он выучил французский, ходил там в местную школу. Испанский тоже освоил очень быстро, да так, что все вокруг утверждают, что не чувствуют у ребенка акцента. Конечно, французский сейчас забывается, разговаривать на нем не с кем. С мамой сын общается на сербском, со мной — на русском. Вообще, дети легко переходят с одного языка на другой.

— Если не теннисистом, кем бы стали?

— Даже представить не могу. Хотя вроде в школе неплохо учился до определенного момента. Потом пришла пора решать, что важнее, на чем сосредоточить внимание. Я выбрал спорт, и на все остальное времени практически не оставалось.

— Никогда не пробовали посчитать, в скольких странах побывали?

— Пока нет. А в принципе, мы играем в одних и тех же местах. Много где побывал в Европе, не раз приезжал в Японию, в Китай, в Сингапур. А вот в Корее пока не был ни разу. Наибольшее же впечатление произвела Австралия. Там какая-то особенная атмосфера, люди очень приветливые. Однажды после чемпионата мира остались на несколько дней в Малайзии. Там недалеко был какой-то остров с потрясающей природой, дикими животными. Это было интересно. А вообще, конечно, когда приезжаешь на соревнования, времени на то, чтобы осмотреть достопримечательности, просто нет. В перерывах между матчами стараешься в первую очередь отдохнуть, расслабиться, сконцентрироваться на игре. Когда турнир заканчивается, хочется как можно быстрее попасть домой. Правда, иногда бывает такое, что удается что-то целенаправленно посмотреть. Помню, в 1995 году после окончания чемпионата мира в Китае пришлось два дня ждать своего рейса. Тогда получилось съездить на экскурсию, увидеть Великую Китайскую стену.

— Не жалеете, что в свое время выбрали спорт?

— Абсолютно. У меня очень интересная жизнь. А что касается бесконечных перелетов, отелей — к этому привыкаешь, относишься как к необходимой составляющей своей профессии, такой же, как и общение с журналистами. Тем более что сейчас, когда живу в Испании, пресса не выстраивается ко мне в очередь за интервью. Там культ футбола, баскетбола...

— В будущем вы себя видите в настольном теннисе или намерены вообще поменять вид деятельности?

— Пока карьеру завершать не собираюсь, потому особо и не задумываюсь о будущем. Наверное, все-таки хотел бы остаться в спорте. Начинать в другой сфере с нуля очень непросто.

Подготовил Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ЗАКУЛИСЬЕ

После России — только на пенсию

Будущий главный тренер сборной России по футболу Дик Адвокат заявил, что после работы в России он завершит тренерскую карьеру. Отвечая на вопрос о том, мог бы он в будущем возглавить другую сборную, 62-летний Адвокат сказал, что после работы в России он будет "слишком стар для этого".

Адвокат подчеркнул, что он уже обговорил детали соглашения с руководством Российского футбольного союза. По словам голландского специалиста, ему представился шанс возглавить "одну из сильнейших сборных мира".

Адвокат сказал, что больше никогда не будет тренировать клубные команды. Адвокат отметил, что он уже "немолод для клубной работы".

О том, что Адвокат возглавит сборную России, будет официально объявлено в ближайшие несколько недель. Голландец подпишет с РФС двухлетний контракт. Ради работы в России Адвокат расторг соглашение со сборной Бельгии.

Молодая, да ранняя

Олимпийская чемпионка 2008 года по спортивной гимнастике американка Шон Джонсон объявила о возвращении в спорт. 18-летняя Джонсон, не участвовавшая в соревнованиях после Олимпиады в Пекине, заявила, что она попытается вернуться в сборную США и выступить на Олимпийских играх 2012 года в Лондоне.

На Играх-2008 американка завоевала золото в упражнениях на бревне, а также выиграла три серебряные медали. В январе 2010 года Джонсон получила травму колена, катаясь на лыжах. В феврале ей была сделана операция, полное восстановление ожидается через два месяца. Спортсменка уже приступила к тренировкам, но пока занимается не в полную силу. Тренер Джонсон рассказал, что в 2010 году гимнастка будет только тренироваться, а на официальных соревнованиях она выступит в 2011 году.

Дань Европе

Президент ФИФА Йозеф Блаттер на встрече с президентом Японской футбольной ассоциации Мотоаки Инукаи и министром спорта Японии Тацуо Кавабата сообщил, что чемпионат мира по футболу 2018 года пройдет в Европе. После встречи с главой ФИФА Япония решила отозвать свою заявку на проведение ЧМ-2018. При этом японцы продолжат борьбу за право организовать ЧМ-2022.

Если проведение ЧМ-2018 действительно будет доверено одной из европейских стран, это означает, что ФИФА выберет организатора первенства планеты из четырех кандидатур: Англии, России, Испании и Португалии (подавших совместную заявку), а также Голландии и Бельгии (еще одна совместная заявка).

Кроме перечисленных стран, заявки на проведение ЧМ-2018 подали США и Австралия. Все указанные страны также претендуют на организацию ЧМ-2022. Однако если проведение ЧМ-2018 будет доверено европейской стране, то ЧМ-2022 пройдет в одной из неевропейских стран. Кроме Японии, за организацию одного только ЧМ-2022 борются еще две страны — Южная Корея и Катар. Организаторы ЧМ-2018 и ЧМ-2022 будут названы 2 декабря 2010 года.

Подготовил Алесь СВЕТЛАНИЧ.

«Дым Айчыны — Чарнобыльскі дым»



Па гарызанталі: 4.Дзень памінання продкаў, калі штогод у адселеныя вёскі з'язджаюцца іх былыя жыхары. 6."..., ...! Адзіны ў сусвеце,//Хто ўсё знае, усё можа — зрабі ж,//Каб за нас не пакутвалі дзеці,//Не яны каб, а мы неслі Крыж!" — з верша Наталлі Арсенневай "Чарнобыль". 7."І здаецца, не ... твой "мірны"//У глухіх ненажэрных катлах" — з верша Анатоля Грачанікава "Ах, Чарнобыль". 9."— Я сумую па Белай Русі//Дачарнобыльскай, чыстаросай" — з верша Эд.Акуліна "Ад чаго ты самотны, ...?". 10.Горад, цэнтр адміністрацыйнага раёна, тэрыторыя якога значна пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы. 12.Тое, што і груган. 14."О, як часта яго мы снім —//Чорны дым, нібы чорны..." — з верша Эд.Акуліна "Дым Айчыны — Чарнобыльскі дым". 19.Прадстаўнік насельніцтва адной з краін, якая ўпершыню ў свеце зведала трагедыю ад ядзернага выбуху. 20.Вышэйшая ступень задавальнення. 21.Асоба, якая назірае за работай машын. 22.Міжнароднае агенцтва па атамнай энергетыцы (абрэв.). 25. ..., альбо ікона: яе пад назвай "Маці Божая ахвяраў Чарнобыля" намаляваў выдатны беларускі мастак Аляксей Марачкін. 30.Ёдзістае ... — высокаэфектыўныя аэразолі, якімі авіяцыя асаджала радыяцыйныя хмары над Гомельшчынай і Магілёўшчынай, ратуючы ад забруджвання землі Расіі. 31."Жураўліны ..." — верш Міколы Мятліцкага ("На зямлі Прысожжа згубна, ціха,//Цэзіем апалена Дняпро"). 32.Тое, што і няпраўдзівы чалавек: той, хто сцвярджае аб бяспецы жыцця на забруджанай тэрыторыі. 33.Бабовая культура, якая менш у параўнанні з іншымі назапашвае радыеактыўныя рэчывы. 34.Невялікі асобны манастыр. 35.Майстрыха па вырабе цацак.

Па вертыкалі: 1.Дуга, па якой выкладаюць арку, скляпенне. 2.Пояс. 3.Жалобны стол па нябожчыку (разм.). 5.Невялікае апавяданне. 6.Вытворчая адзінка атамнай электрастанцыі. 8."— ..., ..., там у Зоне,//Засталася лялька Галя" — з верша Алеся Камароўскага "Чарнобыльская калыханка". 11."Права на ..." — зборнік твораў пісьменніцы, журналісткі Ніны Рыбік, ураджэнкі адселенай вёскі ў Хойніцкім раёне. 13. ..., ці ганьбаванне: яго заслугоўваюць тыя, хто замоўчваў праўду аб чарнобыльскай катастрофе. 15.Папярэдняя аб'ява. 16.Хаатычны ад'езд у бяспечныя раёны большасці наменклатуры ў першыя дні пасля выбуху на ЧАЭС. 17.Райцэнтр на Гомельшчыне, дзе існуе мемарыял у памяць аб адселеных вёсках. 18.Парадак, паслядоўнасць у руху каго-, чаго-небудзь. 23.Воінскае званне Героя Савецкага Саюза Л.Цялятнікава ў час, калі ён кіраваў тушэннем пажару на Чарнобыльскай АЭС. 24."Не ляціце пакуль што туды,//Там, дзе ... разліта шырока" — з верша Юрася Свіркі "Журботны працяг песні". 26."...Палесся" — верш Віктара Яраца. ("Каб не тая ноч красавіка,//Што горыччу дыхнула неспазнанай"). 27."Радыяцыя — нябачны ..." — верш Анатоля Грачанікава ("За ракою пыхкае АЭС.//Без людзей-нагорбіліся хаты"). 28.Устаноўка на АЭС, у якой адбываецца ядзерная рэакцыя. 29.Любіць весь ... лагодны прывет (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ

Па гарызанталі: 4.Радаўніца. 6.Божа. 7.Атам. 9.Бусел. 10.Нароўля. 12.Крумкач. 14.Саван. 19.Японец. 20.Асалода. 21.Механік. 22.МАГАТЭ. 25.Абраз. 30.Серабро. 31.Рэквіем. 32.Ілгун. 33.Рапс. 34.Скіт. 35.Цацачніца.

Па вертыкалі: 1.Кружала. 2.Папруга. 3.Хаўтуры. 5.Навела. 6.Блок. 8.Мама. 11.Адчужэнне. 13.Асуджэнне. 15.Анонс. 16.Уцёкі. 17.Карма. 18.Чарга. 23.Маёр. 24.Прыпяць. 26.Балада. 27.[illegible]. 28.Рэактар. 29.Свет.

МАЗАІКА

Дарагі банер

За нацысцкую выхадку фанатаў футбольны клуб "Дынама" (Мінск) аштрафаваны на 7 тыс. базавых велічынь, што складае 245 млн рублёў. Такое рашэнне прыняў дысцыплінарны камітэт Беларускай федэрацыі футбола, інфармуе прэс-служба БФФ. Гэта самы буйны штраф у гісторыі беларускага футбола.

28 красавіка падчас матчу "Дынама"—"Віцебск" на трыбуне быў вывешаны банер, які ўслаўляў аднаго з дзеячаў фашысцкай Германіі Рудольфа Геса. 26 красавіка споўнілася 116 гадоў з дня нараджэння гэтага ваеннага злачынцы, прыгаворанага Нюрнбергскім трыбуналам да пажыццёвага зняволення.

Між тым ФК "Дынама" выступіў з афіцыйнай заявай, у якой гаворыцца, што клуб *"абураны і шакіраваны"* інцыдэнтам і *"расцэньвае гэтую экстрэмісцкую акцыю як правакацыю, скіраваную супраць клуба, яго балельшчыкаў і ўсяго беларускага футбола"*. Рашэнне дысцыплінарнага камітэта будзе абскарджана.

Змена складу

Хакейнае мінскае "Дынама" абнаўляецца.

Каманду пакідаюць абаронцы Дзюі Уэсткат, Марцін Шэўц, Осі Ваананен, Рыхард Лінтнер, Міка Ёкела, а таксама нападаючыя Віле Пелтанен, які быў капітанам каманды, і Байран Рытчы.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 E-mail : nv@promedia.by http://www.nv-online.by

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 10.05.2010 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 21020 экз. Заказ №2230.